Са збору твораў
«Рысале-і Нур»

# Павучанні Душы

Бадзіуззаман
САІД НУРСІ

Sözler

Са збору твораў «Рысале-і Нур»

# ПАВУЧАННІ ДУШЫ

Бадзіуззаман
Саід Нурсі

2020

# ПАВУЧАННІ ДУШЫ

**«Küçük Sözler» belarusça tercümesi**

Пераклад зроблены паводле арыгіналу:

**«Küçük Sözler».**

**Bediüzzaman Said Nursi.**

**ISBN: 978-975-432-527-0**

**© Выдавецтва: Sözler Neşriyat Tic. ve San. A.Ş. 2020**

**Адрас:** S. Demirel Bulvarı Aykosan San. Sitesi
4'lü A blok Kat: 3 No:244, İkitelli/ K.Çekmece/İstanbul
**Тэл:** +90 212 671 25 47-48 (pbx)
**Сайт:** www.sozler.com.tr
**e-mail:** sozler@sozler.com.tr

Надрукавана ў тыпаграфіі:
İMAK OFSET BASIM YAYIN
YENİBOSNA/ İSTANBUL
+90 212 656 4997 pbx

بِسْمِ اللهِ الرَّحْمٰنِ الرَّحِيمِ

وَ بِهِ نَسْتَعِينُ

اَلْحَمْدُ لِلّٰهِ رَبِّ الْعَالَمِينَ وَالصَّلٰوةُ وَالسَّلَامُ

عَلَى سَيِّدِنَا مُحَمَّدٍ وَعَلَى اٰلِهِ وَصَحْبِهِ اَجْمَعِينَ

*«У імя Аллаха Міласцівага, Міласэрнага!*

*Яго просім аб дапамозе.*

*Хвала Аллаху, Госпаду сусветаў, мір і дабраславенне Прароку Мухаммаду, яго роду і ўсім яго паплечнікам».*

О, браце! Ты папрасіў у мяне некалькі парадаў. Паколькі ты з’яўляешся салдатам, то выслухай некалькі ісцін на прыкладзе васьмі апавяданняў у армейскім духу.

Паслухай іх разам з маёй душой, бо я адчуваю, што яна больш за іншых мае патрэбу ў настаўленні. У свой час, скарыстаўшыся васьмю аятамі, я падрабязна распавёў сваёй душы восем «Слоў». А цяпер я выкажу іх зноў простай мовай і больш сцісла. Хто жадае, можа паслухаць разам з намі.

# Першае Слова

«Бісміллях» – пачатак усяго добрага і дабрадатнага. І мы таксама пачнём з яго. Ведай, о душа мая! Падобна таму, як гэта дабраславёнае слова з'яўляецца сімвалам Іслама, гэтак жа яно з'яўляецца зваротам да Аллаха, няспынна паўтораным на мовах усіх стварэнняў.

Калі хочаш зразумець, якой вялікай невычэрпнай сілай, якой вялікай бясконцай ласкай з'яўляецца «Бісміллях», звярніся да гэтага аповеду, паслухай...

Чалавеку, які вандруе ў пустынях качавой Аравіі, неабходна ўзяць імя правадыра якога-небудзь племені і знаходзіцца пад яго заступніцтвам, каб абараніцца ад злачынстваў разбойнікаў і набыць неабходныя тавары. Інакш у адзіночку ён не зможа супрацьстаяць незлічоным ворагам, і нявыкананымі застануцца яго жаданні.

І вось аднойчы для падобнага падарожжа два чалавекі выйшлі ў дарогу па пустыні. Адзін з іх быў сціплым, другі ж – самаўпэўненым. Той, хто быў сціплым, прыняў заступніцтва аднаго з правадыроў, а другі, са-

маўпэўнены – не. Чалавек, які прыняў заступніцтва, усюды вандраваў у бяспецы і пры сустрэчы з разбойнікамі казаў: «Я вандрую з імем гэткага правадыра», – і яны не асмеліліся зрабіць яму шкоды. Калі заходзіў ён у які-небудзь шацёр, то з тым імем яго прымалі з павагай. Другі ж, самаўпэўнены, за час свайго падарожжа перажыў столькі выпрабаванняў, што апісаць немагчыма. Пастаянна падвяргаўся знявагам, няспынна дрыжэў у чаканні небяспекі.

Такім чынам, о мая самаўпэўненая душа, гэты свет – як тая пустыня, а ты з'яўляешся тым вандроўнікам. Бяссілле тваё і галеча бязмежныя. І праціўнікаў у цябе, і патрэбаў – незлічонае мноства. Дык карыстайся ж імем Вечнага Спадара і адвечнага Уладара гэтага свету. Так ты пазбавішся ад прыніжэння перад усім светам і ад трапятання перад любой падзеяй...

Так, гэта слова з'яўляецца такой дабраславёнай скарбніцай, якая звяжа цябе з бязмежнай магутнасцю і міласэрнасцю Усявышняга, і тваё бязмежнае бяссілле і беднасць стануць найлепшымі заступнікамі ў абіцелі Міласэрнага і Усемагутнага. Хто

дзейнічае з гэтым словам, падобны на чалавека, які паступіў на службу. Ён дзейнічае ад імя дзяржавы. Ён нікога не баіцца. Кажучы: «Імем закона, імем дзяржавы», – выконвае любую работу, вытрымлівае любое выпрабаванне.

У пачатку было сказана: усе стварэнні мовай свайго стану кажуць «Бісміллях».

Ці так гэта? Так, калі ты бачыш, што прыйшоў чалавек, які гвалтоўна сагнаў насельніцтва ўсяго горада ў адно месца і прымусіў іх працаваць, ты без сумненняў ведаеш: гэты чалавек не дзейнічае сваёй сілай, ад свайго імя, безумоўна, ён з'яўляецца служачым дзяржавы. Ён дзейнічае ад імя дзяржавы, абапіраецца на магутнасць кіраўніка.

Такім жа чынам усё вакол дзейнічае з імем Усявышняга: драбнюткае, як макулінкі, насенне нясе ў сабе велізарныя дрэвы, падымае грузы памерам з гару. Атрымліваецца, кожнае дрэва кажа «Бісміллях» і пладамі са скарбніцы Міласці напаўняе свае рукі-галіны, падае іх нам. Кожны сад і агарод кажуць «Бісміллях». Яны – своеасаблівыя катлы з Кухні Магутнасці, у якіх адначасова рыхтуецца мноства разнастайных смачных страў.

Такія дабраславёныя жывёлы, як карова, вярблюдзіца, авечка, каза таксама кажуць «Бісміллях». Яны з'яўляюцца малочнай крыніцай, што выцякае ад багацця Божай ласкі. Ад імя Праўдзівага карміцеля (Разак) падаюць нам самы пяшчотны, самы чысты прадукт, падобны жывой вадзе.

Мяккія, як шоўк, карані і парасткі ўсіх раслін і дрэў кажуць «Бісміллях». Яны прабіваюцца скрозь цвёрдую зямлю і камяні. Яны кажуць: «У імя Аллаха, у імя Міласэрнага», – і ўсё становіцца падуладна ім. Падобна росту галінак і саспяванню на іх пладоў над зямлёй, такое ж зусім вольнае, без усялякіх цяжкасцяў, распаўсюджванне каранёў унутры цвёрдай зямлі і паміж камянёў і іх плоданашэння пад зямлёй, і тое, што далікатныя зялёныя лісты месяцамі захоўваюць у сабе вільгаць пры моцнай спякоце – усё прымушае замаўчаць натураліста (які не бачыць ісціны і прыпісвае гэта законам прыроды), коле яго вочы, і кажа: «І трываласць, і тэмпература, у якіх ты больш за ўсё ўпэўнены, таксама дзейнічаюць па загадзе звыш: гэтыя мяккія, як шоўк, карані, накшталт кія Мусы (Маісея, мір яму), падпарадкоўваю-

чыся Божым наказам:

فَقُلْنَا اضْرِبْ بِعَصَاكَ الْحَجَرَ *«Стукні сваім кіем у скалу!»* (Каран, 2:60), рассякаюць камяні; і тонкія і далікатныя, як папяросная папера, лісце, падобна целу Ібрахіма (Аўраама, мір яму), супраць палаючага жарам агню чытаюць аят: يَا نَارُ كُونِى بَرْدًا وَسَلاَمًا *«О, агонь, будзь прахалодай і мірам!»* (Каран, 21:69). Паколькі ўсе стварэнні духоўна кажуць «Бісміллях» і ад імя Аллаха падаюць нам Яго дары, то мы таксама павінны гаварыць «Бісміллях»: павінны даваць ад імя Аллаха, браць у імя Аллаха, але не павінны браць у людзей, якія забыліся Творцу, якія не даюць ад Яго імя.

**Пытанне.** З людзьмі, якія выступаюць у ролі прадаўцоў, мы чым-небудзь разлічваемся. А якую ж плату патрабуе Аллах, Праўдзівы Гаспадар усяго існага?

**Адказ.** Платай, якую патрабуе ад нас Праўдзівы Дабрадаўца за каштоўныя даброты і багацці, з'яўляюцца тры рэчы: адна з іх – зікр (згадванне Аллаха), іншая – шукур (падзяка Яму), трэцяя – фікр (асэнсаванне).

У пачатку «Бісміллях» – гэта зікр. У кан-

цы «Альхамдуліллях (хвала Аллаху)» – гэта шукур. А ў сярэдзіне – асэнсаванне і ўсведамленне таго, што гэтыя выгоды ёсць дзіўныя цудатворствы, бясцэнныя дары магутнасці і міласці Адзінага і Самадастатковага (Ахад, Самад) – гэта фікр. Будзе па-дурному, калі ты, пацалаваўшы нагу беднага чалавека, які даставіў табе ад аднаго кіраўніка дарагі падарунак, не прызнаеш самога гаспадара таго падарунка (г.зн. кіраўніка), і будзе яшчэ ў тысячу разоў большым глупствам, калі ты, усхваляючы і любячы знешніх дабрадаўцаў, забудзешся на Сапраўднага Дабрадаўцу.

О, душа (нафс)! Каб не быць такой жа дурном, то аддавай у імя Аллаха... бяры ў імя Аллаха... пачынай у імя Аллаха... працуй у імя Аллаха. Вось і ўсё...

* * *

# Другое Слова

بِسْمِ اللّٰهِ الرَّحْمٰنِ الرَّحِيمِ
اَلَّذِينَ يُؤْمِنُونَ بِالْغَيْبِ

*«У імя Аллаха Міласцівага, Міласэрнага. ...Якія вераць у таемнае...»* (Каран, 2:3).

Калі хочаш зразумець, якое вялікае шчасце і дабroты, якая вялікая асалода і спакой заключаюцца ў імане (веры), звярніся да гэтага аповеду, паслухай...

Аднойчы два чалавекі дзеля задавальнення і гандлю адправіліся ў падарожжа. Адзін з іх, сябелюбівы і няўдачлівы, адправіўся ў адзін бок; другі ж, набожны, шчаслівы, – у іншы. Сябелюбівы чалавек быў да таго ж эгаістычным і па сваёй натуры песімістам, і ў пакаранне за свой песімізм ён трапіў, на яго погляд, у вельмі кепскі край. Ён бачыў, што ў тым краі бездапаможныя бедакі стогнуць ад злачынстваў і разбурэнняў тыранаў. Усюды, дзе б ён ні быў, назіраў падобную маркотную і горкую карціну. Увесь край стаў месцам усеагульнага смутку і гора. Сам жа ён, каб не адчуваць гэты цяжкі і змрочны

стан, не змог знайсці іншага выйсця, акрамя ап'янення. Справа ў тым, што ўсе здаваліся яму ворагамі і чужынцамі. Да таго ж вакол ён бачыў бяздушных істот, якія прыводзілі ў жах, і сірот, якія плакалі ў адчаі. Яго душа разрывалася на часткі.

Другі ж, богабаязны, праведны і добрай натуры чалавек, трапіў, на яго погляд, у выдатную краіну. Гэты добры чалавек бачыў у тым краі ўсеагульную радасць, весялосць, свята і месцы пакланення Усявышняму, ахопленыя захапленнем і самазабыццём... Усе здаваліся яму роднымі і блізкімі. Па ўсёй краіне ён бачыў урачыстасці з віншаваннямі і падзякамі з нагоды ўсеагульнай дэмабілізацыі. І акрамя таго, з такбірам і тахлілем ён чуў барабанны бой і радасную музыку для нававбранцаў. Замест пакут першага злашчаснага вандроўніка ад свайго і ўсеагульнага болю гэты чалавек быў шчаслівы і сваёй, і ўсеагульнай радасцю, і на душы ў яго было лёгка і спакойна. Да таго ж ён атрымаў вялікі прыбытак ад гандлю і дзякаваў Аллаху.

Пасля гэтага ён вярнуўся і сустрэўся з тым няшчасным. Зразумеў яго стан і сказаў яму: «Паслухай, дык ты ж быў дурнем! Агід-

насць твайго ўнутранага свету, відаць, адлюстравалася на тваім знешнім свеце: ты ўявіў сабе смех як плач, а дэмабілізацыю – як рабаўніцтва і спусташэнне. Адумайся, ачысці сваё сэрца, каб гэта злашчасная заслона сышла з тваіх вачэй. Ты зможаш убачыць ісціну. Бо краіна аднаго ў бясконцай ступені Справядлівага і Міласэрнага да свайго народа, Магутнага, Любячага парадак і Добрага Гаспадара, поўная дасканалых стварэнняў, не можа быць такой, як паказала тваё ўяўленне». Пасля гэтага няшчасны чалавек апамятаўся і раскаяўся. «Так, ад ап'янення я быў дурнем, – сказаў ён. – Няхай дабраславіць цябе Аллах, ты пазбавіў мяне ад пякельнага, пакутлівага душэўнага стану».

О, душа мая! Ведай жа: той, першы – няверуючы ці грэшны, бестурботны чалавек. Гэты свет, на яго погляд, – месца ўсеагульнай жалобы. А ўсе жывыя істоты – гэта сіраты, якія плачуць ад болю разлук і страт. Жывёлы ж і чалавек – гэта самотныя, безабаронныя, пакінутыя сам насам стварэнні, якіх разрывае лапа смерці. А такія грандыёзныя стварэнні, як горы і моры, – быццам бяздушныя жахлівыя рэшткі... І мноства

яшчэ падобных гэтым вельмі горкіх, панурых, жахлівых думак і разваг, узнікаючы на глебе яго нявер'я і памылак, будуць духоўна мучыць яго.

Другі ж чалавек – веруючы. Ён прызнае і пацвярджае існаванне Вялікага Творцы. На яго погляд, гэты свет – месца ўсхвалення Міласэрнага, вучэбнае поле для чалавека і жывёл, а таксама арэна выпрабаванняў для людзей і джынаў. Смерць жа людзей і жывёл – гэта дэмабілізацыя. Тыя, хто выканаў свой прыжыццёвы абавязак, сыходзяць духоўна задаволенымі з гэтага тленнага свету ў свет іншы, без мітусні і трывог, каб вызвалілася месца новапрыбыўшым радавым, каб яны выконвалі свой абавязак. Нараджэнне ж чалавека і жывёл – гэта мабілізацыя, пачатак іх службы і выканання сваіх абавязкаў. Кожная жывая істота яўляе сабой задаволенага, стараннага і забяспечанага службоўца. А ўсе тыя гукі – гэта або зікр і тасбіх перад пачаткам выканання абавязкаў і шукур і аблягчэнне, звязаныя з адпачынкам пасля здзяйснення доўгу, або ж мелодыі, якія нараджаюцца ад захаплення пры выкананні сваіх абавязкаў. Кожнае са стварэнняў, па-

водле светапогляду праведнага чалавека, з'яўляецца ветлівым слугой, старанным выканаўцам, цікавай кнігай Міласэрнага Госпада, Міласцівага Гаспадара... І мноства падобных гэтым, вельмі вытанчаных і ўзнёслых, светлых і прыемных ісцін узнікае на глебе яго імана (веры).

Значыцца, іман духоўна нясе ў сабе зерне райскай Тубы. Бязбожжа ж захоўвае ў сабе своеасаблівую костачку пякельнага Заккума. Значыць, выратаванне і дабрабыт маецца толькі ў Ісламе і ў імане. У такім выпадку мы безупынна павінны дзякаваць Усявышняму за Іслам і іман, які ёсць у нас:

اَلْحَمْدُ لِلّٰهِ عَلٰى دِينِ الْاِسْلَامِ وَكَمَالِ الْاِيمَانِ

* * *

# Трэцяе Слова

بِسْمِ اللّٰهِ الرَّحْمٰنِ الرَّحِيمِ
يٰٓا اَيُّهَا النَّاسُ اعْبُدُوا

*«У імя Аллаха Міласцівага, Міласэрнага. Людзі! Пакланяйцеся (вашаму Госпаду)...»* (Каран, 2:21).

Калі хочаш зразумець, якім вялікім шчасцем і прыбытковай справай з'яўляецца пакланенне Богу і якой вялікай стратай і крушэннем ёсць грэхападзенне і распуста, звярніся да гэтага аповеду, паслухай...

Аднойчы два салдаты атрымалі загад выправіцца ў адзін далёкі горад. Яны адправіліся ў шлях і ішлі разам, пакуль дарога не раздвоілася. На скрыжаванні яны ўбачылі чалавека, які сказаў ім: «Дарога направа не прынясе страты, і дзевяць з дзесяці падарожнікаў, якія адправіліся па ёй, атрымаюць вялікую карысць і здабудуць спакой. А дарога налева не нясе карысці, і дзевяць з дзесяці яе падарожнікаў панясуць страту. Працягласць абедзвюх дарог аднолькавая.

Розніца толькі ў тым, што вандроўнік левай дарогі, бязладнай і закінутай, падарожнічае без торбы, без зброі. Ён адчуе пэўную знешнюю лёгкасць, здабудзе ўяўны спакой. А вандроўнік правай дарогі з вайсковай дысцыплінай абавязаны несці адну торбу вагой пяць кілаграмаў, поўную спажыўнай ежы, і спраўную зброю вагой два кілаграмы, якая пераможа любога праціўніка».

Калі абодва салдаты выслухалі гэтыя словы, больш сумленны з іх пайшоў па правай дарозе, узваліў на свае плечы і спіну вялікі цяжар. Але яго сэрца і душа пазбавіліся ад тысячы пудоў пачуцця няспраўджанага абавязку і страху. Другі ж, злапомны салдат, пакінуў ваенную службу, не пажадаў выконваць загады. Ён адправіўся па левай дарозе. Яго цела пазбылася ад вялікага цяжару, але яго сэрца раздзіралася ад тысяч пудоў пачуцця адказнасці, а душа – ад шматлікіх страхаў. І ішоў ён, перад усімі прыніжаючыся, усяго баючыся, дрыжучы ад страху перад любой падзеяй і з'явай, і дасягнуў нарэшце месца прызначэння. А там атрымаў пакаранне за непадпарадкаванне і дэзерцірства.

А салдат, які рухаўся па правым шляху, які любіў дысцыпліну і захоўваў сваю торбу і зброю, не просячы нічыёй міласці і нікога не баючыся, са спакойным сэрцам і сумленнем ішоў па сваім шляху. І дасягнуў, нарэшце, таго жаданага горада. А там атрымаў узнагароду, годную сумленнага салдата, які годна выканаў свой абавязак.

Дык вось, непакорлівая душа! Ведай жа, адзін з гэтых двух падарожнікаў – падпарадкаванасць Божым запаведзям, другі – непакорлівыя Усявышняму і падуладныя жарсцям людзі. А тая дарога – жыццёвы шлях, які, беручы пачатак у Свеце душ, праходзіць праз магілу ў іншы свет – Ахірат. Торба і зброя – гэта пакланенне Богу і набожнасць. Хоць і існуе ў пакланенні знешняя абцяжаранасць, аднак у яе сутнасці ёсць такое заспакаенне і аблягчэнне, што гэта з’яўляецца неверагодным. Справа ў тым што той, хто шануе Усявышняга, кажа ў сваёй малітве (намазе):

اَشْهَدُ اَنْ لَا اِلٰهَ اِلَّا اللّٰهُ

Гэта азначае: «Акрамя Яго, няма іншага Творцы і Карміцеля! Карысць і шкода – у

Ягоных руках. Ён і Мудры, дарэмнай дзеі не ўчыніць, і Міласэрны, Яго міласць і дабрыня бязмежныя». І з прычыны такога перакапання чалавек усюды знаходзіць уваход да скарбніцы Божай ласкі і стукаецца ў яе браму малітвай. Акрамя таго, ён усё бачыць пакорным наказам свайго Госпада, шукае ў Яго абароны, і, спадзеючыся на Усявышняга і давяраючы Яму, супрацьстаіць любой бядзе. Яго вера забяспечвае яму поўную ўпэўненасць.

Так, як крыніцай усяго праўдзівага добрага, мужнасці і адвагі з'яўляецца Іман (вера) і пакланенне Богу, так крыніцай усялякага зла і грахоў, баязлівасці і маладушнасці з'яўляецца памылковая, зманлівая думка!

Калі Зямля выбухне як бомба, магчыма, гэта не напалохае духоўна сталага чалавека, які пакланяецца свайму Госпаду. Хутчэй наадварот – ён з асаблівым захапленнем будзе сузіраць дзівосную Божую Магутнасць. Аднак які-небудзь аблудны, пазбаўлены духоўнасці філосаф, што ўспрымаецца адным з геніяў думкі, убачыўшы на небе камету, будзе трапятаць на Зямлі. «Цікава, а ці не

сутыкнецца гэтая шалёная камета з нашай Зямлёй?» – падумае ён, і яго ахопяць неспакой і сумневы (аднойчы з-за падобнай каметы трапятала Амерыка, і шмат хто ў начны час пакінуў свае дамы).

Так, чалавек мае патрэбу шмат у чым, але яго капітал блізкі да нуля... І акрамя таго, што ён схільны да шматлікіх бедаў, яго магчымасці нікчэмна малыя... Межы аб'ёму яго капіталу і магчымасцяў толькі ледзь дасягаюць ахопу яго рук. Аднак яго імкненні, жаданні, беды і пакуты настолькі бязмежныя, наколькі змогуць ахапіць іх межы думкі, погляд, мары, наколькі наогул магчыма ўявіць. Такім чынам, той, хто цалкам не аслеп, убачыць і ўсвядоміць, наколькі пакланенне Усявышняму, спадзяванне на Яго, адзінабожжа і пакорлівасць з'яўляюцца вялікай карысцю, дабрабытам і міласцю для настолькі бездапаможнай і слабой, беднай чалавечай душы, якая жыве ў нястачы. Вядома, што калі маюцца два шляхі, то перавага будзе аддавацца больш бясстратным, нават калі верагоднасць бясстратнасці роўная аднаму да дзесяці. Між тым шлях служэння, глыбокай пашаны Богу акрамя таго, што

з'яўляецца бясстратным, на ім з верагоднасцю дзевяць з дзесяці маецца скарбніца вечнага шчасця. А шлях граху і распусты, акрамя таго, што з'яўляецца – нават па прызнанні самога грэшніка – нявыгадным, вядзе з верагоднасцю дзевяць з дзесяці да жаху вечных пакут, што адзінагалосна ўстаноўлена і вызначана па сведчаннях многіх пракакаў і святых.

Адным словам, шчасце і дабрабыт як жыцця будучага, так і зямнога заключаецца ў глыбокай пашане, служэнні і пакоры Аллаху. Такім чынам, мы заўсёды павінны дзякаваць Аллаху за нашу набожнасць і праведнасць:

اَلْحَمْدُ لِلّٰهِ عَلَى الطَّاعَةِ وَالتَّوْفِيقِ

* * *

# Чацвёртае Слова

بِسْمِ اللّٰهِ الرَّحْمٰنِ الرَّحِيمِ

اَلصَّلٰوةُ عِمَادُ الدِّينِ

*«У імя Аллаха Міласцівага, Міласэрнага. Намаз – апора рэлігіі»* (хадзіс).

Калі хочаш ясна, як два на два чатыры, усвядоміць, наколькі каштоўны і важны намаз, і з якім невялікім намаганнем ён выконваецца, і наколькі неразумным з'яўляецца, наколькі церпіць страту чалавек, які яго не здзяйсняе, звярніся да гэтага аповеду, паслухай...

Аднойчы адзін вялікі ўладар адправіў двух сваіх слуг, уручыўшы кожнаму з іх па дваццаць чатыры залатыя манеты, у адзін свой адметны цудоўны маёнтак, які знаходзіўся на адлегласці двухмесячнага шляху, каб яны пражывалі там. І загадаў ім: «Гэтыя грошы выкарыстайце на дарожныя выдаткі і на набыццё білета. Акрамя таго, закупіце некаторыя неабходныя для пражывання там рэчы. На адлегласці аднадзённага шляху

знаходзіцца станцыя, дзе маюцца і аўтобус, і параход, і цягнік, і самалёт, на якіх можна дабрацца да маёнтка ў залежнасці ад наяўнага капіталу».

Выслухаўшы настаўленне, слугі адправіліся ў дарогу. Адзін з іх быў шчаслівым: да прызначанай станцыі ён патраціў некаторую частку сваіх грошай. Аднак з гэтай затраты ён здабыў добры прыбытак, які так спадабаецца яго гаспадару, што капітал слугі ўзрасце ў тысячу разоў.

Другі ж, злашчасны слуга з-за свайго шалапуцтва патраціў да прыбыцця на станцыю дваццаць тры залатыя манеты. Страціў іх, спусціўшы на ўсялякія азартныя гульні. І засталася ў яго ўсяго толькі адна залатая манета. Яго таварыш параіў яму: «Паслухай! Выкарыстай гэтую манету на білет, каб не ісці па гэтай доўгай дарозе пешшу і не застацца галодным. Да таго ж наш Гаспадар велікадушны. Несумненна, ён зжаліцца над табою і прабачыць зробленую табой памылку. І цябе таксама пасадзяць у самалёт, і мы за дзень дабярэмся да нашага месца жыхарства. Інакш ты будзеш вымушаны галодным, самотным два месяцы ісці пешшу па

якой-небудзь пустыні». І ці ж не зразумее нават самы неразумны чалавек, наколькі гэты падарожнік акажацца злашчасным вар'ятам, якую страту ён панясе, калі, заўпарціўшыся, не патраціць гэту адну-адзінюткую манету на білет, які будзе ключом ад скарба, а патраціць на распусту і часовую ўцеху?

Дык вось, чалавеча, які не здзяйсняе намазу! О, мая душа, якая лянуецца здзяйсняць яго!

Тым уладаром з'яўляецца наш Гасподзь, наш Творца. Адзін з двух слуг-падарожнікаў – гэта людзі набожныя, якія з запалам здзяйсняюць намаз; другі ж – людзі бесклапотныя, якія не здзяйсняюць яго. А тыя дваццаць чатыры залатыя манеты – гэта штодзённае дваццаці чатырох гадзіннае жыццё. Той адмысловы маёнтак – гэта Рай, станцыяй з'яўляецца магіла. А тое падарожжа – гэта шлях чалавека, шлях, які сыходзіць у магілу, у Хашыр, у вечнасць. Людзі, у залежнасці ад сваіх учынкаў, ад ступені сваёй набожнасці, па-рознаму пераадолеюць тую доўгую дарогу. Некаторая частка праведных людзей, як маланка, за дзень пройдзе тысячагадовы

шлях. Другая ж іх частка з хуткасцю думкі пераадолее за той жа час адлегласць у пяць-дзесяць тысяч гадоў, Вялікі Каран указвае на гэта двума аятамі. А тым білетам з'яўляецца намаз – усяго толькі адной гадзіны будзе дастаткова для здзяйснення пяцікратнага намазу разам з абмываннем (тахарат).

І як жа пацерпіць сам чалавек, як несправядліва ён абыдзецца са сваёй душой, наколькі супярэчлівы розуму ўчынак ён зробіць, аддаючы свае дваццаць тры гадзіны на гэта кароткае зямное жыццё і не выкарыстоўваючы ўсяго толькі адну гадзіну для бесконцага вечнага жыцця! Бо калі розум згадзіцца аддаць палову свайго багацця на азартную латарэю, у якой удзельнічае тысяча чалавек (між тым як верагоднасць выйгрышу – адна з тысячы), ці не ўсвядоміць пасля гэтага чалавек, які сябе лічыць разважлівым, наколькі далёкія яго паводзіны ад разумнага сэнсу і наколькі ён уваходзіць у супярэчнасць з розумам і мудрасцю, не адкладаючы адну дваццаць чацвёртую частку свайго багацця ў вечную скарбніцу, здабыванне якой запэўнена з дзевяноста дзевяці

працэнтнай магчымасцю?

Між тым у намазе здабываецца спакой і душы, і сэрца, і розуму, да таго ж і для цела чалавека гэта не настолькі ўжо цяжкая справа. Акрамя таго, усе астатнія, якія не змяшчаюць грахоў, зямныя справы (мубах) чалавека, які здзяйсняе намаз, з дапамогай добрага намеру набудуць значэнне пакланення Усявышняму. Такім чынам чалавек усё сваё зямное існаванне можа зрабіць набыткам будучага жыцця ў Вечным свеце, увекавечыўшы сваё тленнае жыццё.

* * *

## Пятае Слова

بِسْمِ اللهِ الرَّحْمٰنِ الرَّحِيمِ
اِنَّ للهَ مَعَ الَّذِينَ اتَّقَوْا وَالَّذِينَ هُمْ مُحْسِنُونَ

*«У імя Аллаха Міласцівага, Міласэрнага. Сапраўды, Аллах – з тымі, якія баяцца (Яго), і з тымі, якія робяць дабро!»* (Каран, 16:128).

Калі хочаш усвядоміць, у якой ступені сапраўдным чалавечым абавязкам і наколькі натуральнай, годнай мэтай стварэння чалавека з'яўляецца выкананне намазу і не здзяйсненне вялікіх грахоў, звярніся да гэтага аповеду, паслухай...

Падчас мабілізацыі ў адным атрадзе служылі два салдаты, адзін з якіх быў навучаным, з пачуццём абавязку, другі ж – неспрактыкаваным і карыслівым. Той з іх, які меў адчуванне абавязку, клапаціўся пра падрыхтоўку і думаў пра барацьбу з супернікам. Ён зусім не турбаваўся пра правіянт і забеспячэнне, бо разумеў: дастаўляць ежу, рыхтаваць, калі захварэе – лячыць і нават, у выпадку неабходнасці, карміць яго з лыжкі – абавязак дзяржавы. А яго асноўны абавя-

зак – падрыхтоўка і барацьба. Аднак часам ён працаваў на кухні, часам – у тэхнічнай частцы, рыхтаваў вячэру, мыў посуд і да т.п. Калі ў яго пыталіся: «Чым ты займаешся?» – ён адказваў: «Нясу дзяржаўную службу». Але не казаў: «Я працую, каб пракарміць сябе». А другі салдат, карыслівы і неспрактыкаваны, і не думаў пра падрыхтоўку і барацьбу. «Гэта дзяржаўныя справы. Што мне з таго!» – казаў ён. Пастаянна думаючы пра сродкі існавання, мітусіўся ў іх пошуку: пакідаў атрад, сыходзіў на кірмаш, займаўся гандлем. Неяк раз яго вопытны таварыш сказаў яму: «Браце мой, твой асноўны абавязак – навучанне і барацьба. Ты накіраваны сюды для гэтага. Даверся нашаму кіраўніку, ён не пакіне цябе галодным. Гэта яго абавязак. Да таго ж ты бяссільны, і бедны, не зможаш усюды пракарміць сябе, акрамя таго, зараз час службы і мабілізацыі. І ў дадатак назавуць цябе парушальнікам, пакараюць. Так, ёсць два абавязкі. Адзін з іх – абавязак кіраўніка карміць нас; мы ж толькі часам удзельнічаем у гаспадарчых работах. Іншы – наш абавязак навучацца і весці барацьбу з праціўнікам; кіраўнік, падрыхтаваны, дапамагае нам».

І ты зразумееш, у якой небяспецы апынецца той недарэка, калі ён не паслухаецца дасведчанага салдата.

Такім чынам, о, мая лянівая душа! То месца службы – гэта наша неспакойнае зямное жыццё; падзеленая на атрады армія – чалавечае грамадства. А той атрад – ісламскі свет нашага часу, адзін з тых двух салдат – праведны мусульманін, які ведае, хто жыве паводле прадпісання сваёй рэлігіі, які змагаецца з самім сабой, са сваімі спакусамі і сатаной, каб пазбягаць і не здзяйсняць грахоў. А другі, – аблудны грэшны чалавек, які шкодзіць самому сабе, які, пагрузіўшыся ў мітуслівыя клопаты пра харчаванне да ўзроўню дакору Праўдзівага карміцеля, не выконвае асноўныя прадпісанні рэлігіі (фарз) і здзяйсняе грахі, сутыкаючыся з імі на шляху жыццёвых клопатаў. А тым навучаннем, падрыхтоўкай і статутам з'яўляецца, у першую чаргу, намаз – глыбокая пашана Усявышняга. Барацьба ж з праціўнікам азначае барацьбу з самім сабой, са сваімі жарсцямі, з шайтанамі з джынаў і людзей, каб пазбягаць здзяйснення грахоў, пазбаўляць сябе ад амаральнасці, а сваё сэрца і душу

ратаваць ад вечнага падзення і разбурэння. Адзін з тых двух абавязкаў – даваць жыццё і клапаціцца пра яе; іншы – пакланяцца Таму, Хто дае жыццё і праяўляе клопат пра яго, маліцца Яму і ў надзеі на Яго, даверыцца Яму.

Так, Той, Хто даў і ўладкаваў жыццё – самы яркі цуд Божага мастацтва і дзіва Гасподняй мудрасці – з'яўляецца і Тым, Хто дае сродкі для яе падтрымання і падаўжэння. Іншага, акрамя Яго, няма! Просіш доказаў? Самыя слабыя, самыя неразумныя жывёлы сілкуюцца лепш за іншых (напрыклад, пладовыя чарвякі і рыбы). Самыя бездапаможныя, самыя далікатныя стварэнні кормяцца самай лепшай ежай (напрыклад, дзеці і маладыя жывёліны).

Так, каб зразумець, што дазволеная Усявышнім (халяль) ежа здабываецца не сродкамі сілы і волі, а з дапамогай бездапаможнасці і слабасці, дастаткова параўнаць рыб з лісіцамі, дзіцянятаў з драпежнікамі, дрэвы з жывёламі. Атрымліваецца, чалавек, пагарджае намазам з-за клопатаў пра ежу, падходзіць на таго салдата, які, кінуўшы вучэнні і падрыхтоўку і пакінуўшы сховішча,

жабруе на базары. Аднак жа пасля здзяйснення намазу асабіста пайсці шукаць сваю долю са скарбніцы міласці Усявышняга Міласцівага карміцеля, каб не быць цяжарам для іншых, – гэта выдатна, высакародна; і гэта таксама з'яўляецца глыбокай пашанай.

Прырода і духоўная сутнасць чалавека паказваюць на тое, што ён створаны дзеля таго, каб пакланяцца свайму Стваральніку. Бо з пункту гледжання спраў і магчымасцей, неабходных для яго жыцця ў гэтым свеце, ён не дасягне звычайнага вераб'я. Аднак у дачыненні да малітвы і глыбокай пашаны Аллаху (з веданнем і пакорай), неабходных у яго духоўным і вечным жыцці, чалавек знаходзіцца ў становішчы кіраўніка ўсяго жывога на Зямлі.

О, душа мая! Калі паставіш за галоўную мэту зямное жыццё і заўсёды будзеш працаваць дзеля яе, то будзеш падобны самому звычайнаму вераб'ю. Калі ж паставіш галоўнай мэтай жыццё ў Вечным свеце, а свецкае жыццё зробіш сродкам для дасягнення гэтай мэты і будзеш працаваць у імя яе, тады ты будзеш правадыром усяго жывога на Зямлі, а таксама на гэтым свеце будзеш на-

божным рабом у міласці Усявышняга і Яго дарагім і ганаровым госцем. Такім чынам, у цябе два шляхі... Ты можаш абраць жаданы. Шлях ісціны і дапамогу прасі ў Міласцівага, Міласэрнага...

* * *

# Шостае Слова

بِسْمِ اللّٰهِ الرَّحْمٰنِ الرَّحِيمِ
اِنَّ اللّٰهَ اشْتَرٰى مِنَ الْمُؤْمِنِينَ اَنْفُسَهُمْ
وَاَمْوَالَهُمْ بِاَنَّ لَهُمُ الْجَنَّةَ

*«У імя Аллаха Міласцівага, Міласэрнага. Сапраўды, Аллах купіў у вернікаў іх жыццё і маёмасць у абмен на Рай»* (Каран, 9:111).

Калі хочаш зразумець, наколькі гэта выгадны гандаль, наколькі пачэснае становішча – даверыць сваю душу і маёмасць Усявышняму, а таксама быць яму рабом, паслухай гэты аповед...

Аднойчы адзін уладар даручыў двум сваім падданым па адной гаспадарцы, у кожнай з якіх меліся і фабрыка, і абсталяванне, і конь, і зброя, і ўсё неабходнае. Аднак з прычыны бурнага часу ўсё было нестабільным, няўстойлівым: ці разбурыцца і згіне, ці ж зменіцца і прападзе. Уладар з ласкі накіраваў да тых двух падданых свайго самага шаноўнага пасланца. Вельмі літасціва загадаў ім:

«Гаспадарку, што знаходзіцца ў вашым распараджэнні, якую я даверыў вам, прадайце мне, каб я захаваў яе для вас. Няхай не прападае дарма. Да таго ж пасля заканчэння вайны вярну вам яе ў яшчэ лепшым выглядзе і, быццам гэта гаспадарка – ваша маёмасць, дам вам за яе вельмі высокую цану.

Акрамя таго, машыны і прылады, якія маюцца на фабрыцы, будуць эксплуатавацца з маім імем і ў маёй майстэрні. І кошт іх, і плата за іх узрастуць у тысячу разоў. Увесь гэты прыбытак я перадам вам.

Да таго ж вы бяссільныя і бедныя. Вы не зможаце панесці выдаткі тых грандыёзных спраў. Усе выдаткі і матэрыяльную частку я вазьму на сябе, а ўсе паступленні і выгаду аддам вам.

І пры гэтым усю гаспадарку я пакіну ў вашым распараджэнні да часу дэмабілізацыі. Такім чынам, у пяці выпадках гэтая справа выгадная для вас!

Калі ж не прададзіце мне, то і самі бачыце: ніхто не можа захаваць маёмасць – як ва ўсіх, выслізне і з вашых рук. І прападзе дарма, і страціце тую высокую цану.

Да таго ж тыя тонкія каштоўныя інстру-

менты, абсталяванне, не знайшоўшы якаснай сыравіны і належнага прымянення, цалкам згубяць сваю каштоўнасць.

Акрамя таго, на вас наваляцца клопаты і цяжкасці, звязаныя з іх захоўваннем і кіраваннем імі. Яшчэ і пападзеце пад пакаранне за тое, што не захавалі даверануюю вам маёмасць. Такім чынам, у пяці выпадках гэтая справа нявыгадная для вас...

І да таго ж прадаць мне – гэта значыць, стаўшы маім падданым, распараджацца маёмасцю ад майго імя. Замест зняважанага нявольніка і мяцежніка станеце свабодным чалавекам, які выконвае асабліва важныя даручэнні вялікага ўладара».

Выслухаўшы гэты добразычлівы загад, той чалавек, які быў разважлівым, сказаў: «Ёсць! Я з задавальненнем прадам сваю маёмасць. Да таго ж я выказваю тысячу падзяк нашаму ўладару».

Другі ж, самаўпэўнены, з фанабэрыстай душой фараона, сябелюбны, ап’янелы, быццам назаўжды застанецца ў гэтай гаспадарцы – як быццам не ведае пра зямныя хваляванні і трывогі – сказаў: «Не! Хто такі ўладар? Я не прадам сваю маёмасць, не буду

псаваць сваю асалоду!..».

Праз некаторы час першы чалавек узвысіўся да такой ступені, што ўсе сталі зайздросціць яго становішчу: заслужыў ласкі ўладара, шчасліва жыве ў яго палацы. Другі ж апынуўся ў такім стане, што ўсе і шкадуюць яго, і гавораць: «Заслужыў! Так і трэба яму». Бо ў выніку яго памылкі прапала яго шчасце і маёмасць, і цяпер ён нясе пакаранне і пакутуе.

Дык вось, о душа, поўная жарсцяў і памкненняў! Паглядзі праз падзорную трубу дадзенага прыкладу на сутнасць гэтай ісціны. Тым Уладаром з'яўляецца Цар Спрадвечнасці і Вечнасці – твой Гасподзь і Тварэц. А тыя гаспадаркі, абсталяванне, інструменты, прылады – гэта маёмасць, дадзеная ў распараджэнне ў тваім жыцці, а таксама ўваходзяць у гэтую маёмасць тваё цела, душа і сэрца і такія знешнія і ўнутраныя сродкі ўспрыняцця, як вочы і язык, розум і ўяўленне. Той пачэсны пасланец – прарок Мухаммад (мір яму і дабраславенне Усявышняга). А той загад – гэта Мудры Каран, які абвяшчае пра вялікі гандаль, што з'яўляецца тэмай нашага Слова, наступным аятам:

اِنَّ اللّٰهَ اشْتَرٰى مِنَ الْمُؤْمِنِينَ اَنْفُسَهُمْ
وَاَمْوَالَهُمْ بِاَنَّ لَهُمُ الْجَنَّةَ

*«Сапраўды, Аллах купіў у вернікаў іх жыццё і маёмасць у абмен на Рай»* (Каран, 9:111).

А тым бурным часам з'яўляецца наш неспакойны свет, які безупынна знаходзіцца ў руху, змяняецца, разбураецца, і розум усякага чалавека прыводзіць да такой думкі: «Калі ўсё выслізне з нашых рук, стаўшы старым, знікне, ці няма спосабу змяніць такое становішча рэчаў, зрабіць іх вечнымі?» Знаходзячыся ў такім роздуме, раптам пачуе нябесны голас Карану: «Так, ёсць. Да таго ж існуе адзін цудоўны і зручны спосаб, выгадны ў пяці выпадках».

**Пытанне**: што ж гэта за спосаб?

**Адказ**: прадаць (г.зн. прысвяціць) тое, што даверана табе Тварцом, іх Сапраўднаму Гаспадару... У гэтым продажы ў пяці выпадках маецца прыбытак.

**Першы прыбытак:** тленная маёмасць займее вечнасць. Справа ў тым, што гэтае недаўгавечнае жыццё, перададзенае Велічнаму, Вечна Існаму (Каюм-у Бакі) і патрачанае

на Яго шляху, абернецца ў вечнасць, прынясе вечны плён. Тады хвіліны жыцця, бы насенне і зярняты, знешне загінуць, згніюць. Аднак жа ў свеце Вечнасці яны вырастуць і раскрыюцца кветкамі шчасця. А ў замагільным свеце Барзах кожная з іх стане светлай і прыемнай панарамай.

**Другі прыбытак:** прызначаецца такая цана, як Рай.

**Трэці прыбытак**: вартасць кожнага органа і пачуцця ўзрасце ў тысячу разоў.

Напрыклад, розум – гэта інструмент. Калі, не прысвяціўшы яго Усявышняму, скарыстаеш на карысць сваіх жарсцяў, то ён стане такім злашчасным, гаркотным і дакучлівым інструментам, што апусціцца на ўзровень шкоднай і згубнай прылады, якая зваліць на тваю няшчасную галаву цяжар горкага душэўнага болю мінулага і страхаў невядомасці будучага. І вось таму грэшны чалавек, каб пазбавіцца ад трывогі і дакучлівасці розуму, часцей за ўсё звяртаецца ці да самаап'янення, ці да ўцехаў. Калі ж прысвяціш розум яго Сапраўднаму Гаспадару і будзеш выкарыстоўваць у імя Яго, ён стане такім чароўным ключом, што адкрые

табе скарбніцы бясконцай міласці і мудрасці, якія ёсць у сусвеце. І праз гэта розум узвысіцца да ступені настаўніка (Муршыд-і Раббані), які рыхтуе свайго гаспадара да вечнага шчасця.

Напрыклад, вочы падобныя да вокнаў, праз якія душа сузірае наш свет. Калі, не прысвяціўшы вочы Усявышняму, скарыстаеш на карысць сваіх жарсцяў, яны, гледзячы на некаторае часовае, нядоўгае хараство, апусцяцца на ўзровень бессаромнага зводніка, стануць слугой юрлівасці і нізкіх жарсцяў. А калі прысвяціш вочы іх Усёвідушчаму Тварцу і выкарыстаеш у імя Яго і ў межах дазволенага Ім, тады яны ўзвысяцца на ўзровень даследчыкаў Вялікай Кнігі Сусвету і гледачоў Цудаў Божага Мастацтва, якія знаходзяцца ў нашым свеце, а таксама благаслаўлёнай пчалы кветак Божай міласці, што растуць у гэтым садзе Зямлі.

Напрыклад, калі не прадасі смакавыя адчуванні языка яго Мудраму Тварцу, а наадварот, выкарыстаеш на карысць сваіх жарсцяў, на карысць свайго страўніка, то ён апусціцца на ўзровень нейкага вахцёра фабрыкі страўніка. Калі ж прадасі, гэта значы-

ць будзеш выкарыстоўваць яго ў імя Міласцівага Карміцеля, тады смакавыя адчуванні языка ўзвысяцца да становішча ўмелага наглядчыка скарбніц Божай Міласці і ўдзячнага інспектара кухань Божай Магутнасці.

Дык вось, о розум! Звярні ўвагу! На якім узроўні злашчасны інструмент? І на якім – ключ сусвету? О вочы! Добра глядзіце! На якой ступені нізкі зводнік? І на якой – адукаваны даследчык Божай бібліятэкі? О язык? Рассмакуй добра! На якім узроўні вартаўнік фермы і ахоўнік фабрыкі? І на якім – наглядчык асабістых скарбніц Божай Міласці?..

І калі яшчэ параўнаеш іншыя, падобныя гэтым, інструменты і органы, то зразумееш, што, сапраўды, праведны чалавек заслужыў Рай, а бязбожны чалавек набывае сутнасць, падобную Пеклу. Кожны з іх атрымлівае такую ацэнку таму, што богабаязны чалавек з дапамогай сваёй веры скарыстоўвае даверанае яму Творцам у імя Яго і ў межах дазволенага Ім. Бязбожны ж чалавек, здзейсніўшы вераломства, скарыстоўвае гэта на карысць сваіх нізкіх жарсцяў.

**Чацвёрты прыбытак:** чалавек слабы, а

бед у яго шмат; бедны, а патрэбы яго дужа істотныя; бяссільны, а ноша жыцця вельмі цяжкая. І калі ён, не даверыўшыся Усемагутнаму, не стане спадзявацца на Яго і не скарыцца Яму, то яго душа вечна будзе пакутаваць. Бессэнсоўныя пакуты, душэўны боль, шкадаванне задушаць яго і зробяць з яго ці прапойцу, ці звера.

**Пяты прыбытак:** пакланенні і ўслаўленні Тварца (тасбіхат) усіх органаў і інструментаў і высокія ўзнагароды за іх адплочаныя будуць у выглядзе райскіх пладоў у той час, калі ты будзеш мець вялікую патрэбу. У гэтым аднадушныя ўсе прарокі і святыя.

Дык вось, калі ты не заключыш гэту ў пяці адносінах выгадную дамову, акрамя таго што застанешся без дадзеных прыбыткаў, панясеш у пяці выпадках страты.

**Першая страта**: маёмасць і дзеці, настолькі любыя табе, твае схільнасці і захапленні, маладосць і жыццё, якія ты горача любіш, прападуць, выслізнуць з тваіх рук. Але, пакінуўшы табе свае грахі і горыч, ускладуць іх цяжар на цябе.

**Другая страта:** панясеш пакаранне за здраду таму, што даверана табе Усявышнім.

Справа ў тым, што ты, скарыстаўшы самыя каштоўныя інструменты для самых танных рэчаў, зрабіў несправядліва ў адносінах да сваёй натуры.

**Трэцяя страта:** апусціўшы ўсе гэтыя бясцэнныя чалавечыя органы і здольнасці шмат ніжэй за жывёльны ўзровень, ачарніў Божую Мудрасць і абышоўся несправядліва ў адносінах да яе.

**Чацвёртая страта:** нягледзячы на сваё бяссілле і беднасць, узваліўшы яшчэ і гэтую вельмі цяжкую ношу жыцця на свае слабыя плечы, вечна будзеш стагнаць ад болю растанняў і страт.

**Пятая страта:**ператварэнне такіх цудоўных дароў Міласэрнага, як розум, сэрца, вочы і язык, якія дадзены табе, каб падрыхтаваць асновы Вечнага жыцця і ўсё неабходнае для шчасця ў Іншым свеце, у брыдкі і агідны вобраз, які адкрые табе вароты Апраметнай.

А зараз вернемся да продажу (г.зн. прысвячэнню сябе Усявышняму). Няўжо гэта нешта настолькі цяжкае, што шмат хто пазбягае гэтага? Канечне, не!.. Ні ў якім разе, няма зусім ніякага цяжару. Бо межы дазво-

ленага (халяль) вялікія і дастатковыя для прыемнасцяў, і зусім няма патрэбы лезці ў забароненае (харам). Абавязковыя ж Божыя запаведзі (фарз) лёгкія, нешматлікія. Быць Аллаху рабом (г.зн. пакланяцца і служыць Яму) – гэта настолькі прыемны гонар, што словамі не перадаць. Абавязкам жа з'яўляецца толькі, падобна да службоўцы, працаваць і пачынаць у імя Аллаха... даваць і браць дзеля Яго... дзейнічаць у межах дазволенага Ім, у рамках Яго закона, дзякуючы чаму знайсці спакой... зрабіўшы ж памылку, прасіць прабачэння:

*«О, Божа! Прабач нам грахі нашы... Прымі нас як рабоў Сваіх. Дай нам вернасць у захаванні таго, што давер'ыў Ты нам на час. Амінь!».*

* * *

## Сёмае Слова

Калі хочаш зразумець, наколькі дзве каштоўныя таямніцы, што пазбаўляюць ад усіх цяжкасцей, сфармуляваны ў словах

آمَنْتُ بِاللّٰهِ وَبِالْيَوْمِ الْآخِرِ

«*Уверваў у Аллаха і ў Судны дзень*», якія раскрываюць загадку нашага сусвету і адкрываюць для чалавечай душы дзверы шчасця, і наколькі двума карыснымі і лячэбнымі, падобнымі да проціяддзя, сродкамі з'яўляюцца цярплівае спадзяванне на свайго Стваральніка, зварот з удзячнасцю, просьбамі і малітвамі да свайго карміцеля, а таксама наколькі важным, дарагім і каштоўным білетам на шляху да Вечнасці, правізіяй свету іншага, святлом у цемры магілы з'яўляюцца слуханне Карану, падпарадкаванне яго прадпісанням, выкананне намазу, не здзяйсненне вялікіх грахоў, звярніся да дадзенага аповеду, паслухай...

Аднойчы адзін салдат на поле бітвы і выпрабаванняў у кругазвароце выгод і страт апынуўся ў вельмі гаротным становішчы: на

целе яго з правага і з левага бакоў дзве глыбокія раны, ззаду ад яго – велічэзны леў, які нібы чакае моманту, каб напасці. А перад ім – шыбеніца, якая губіць усіх яго любімых ды чакае і яго самога. Акрамя таго, яму яшчэ трэба было прайсці доўгую дарогу высылкі. І раптам да гэтага няшчаснага, прыгнечанага горасцямі салдата з правага боку з'явіўся добразычлівы прамяністы чалавек, падобны Хызыру, і сказаў яму: «Не адчайвайся! Я адкрыю табе дзве таямніцы. Калі як след скарыстаешся імі, той леў стане табе пакорлівым канём, а тая шыбеніца ператворыцца для цябе ў арэлі для задавальнення і забавы. Акрамя таго, дам табе два лячэбных сродкі. Калі па-добраму выкарыстаеш іх, гэтыя дзве твае гнілыя раны ператворацца ў дзве кветкі з далікатным водарам, званых «Гюл-ю Мухаммадзі» (г.зн. ружай Мухаммада, свет яму і дабраслаўленне Усявышняга). І яшчэ дам табе адзін білет. З дапамогай яго ты нібы паляціш – за дзень пераадолееш гадавы шлях. А калі не верыш, то паспрабуй, правер, каб ты зразумеў, што гэта так». І сапраўды, ён паспрабаваў, праверыў і пацвердзіў слушнасць яго слоў. (Так, і я, бедны Саід, таксама запэўніваю гэта. Справа ў тым, што я крыху

паспрабаваў, праверыў і ўсвядоміў, што гэта цалкам справядліва).

Пасля гэтага салдат нечакана ўбачыў, як злева падышоў да яго адзін падступны, як нячысцік, хмяльны, хлуслівы чалавек. У яго было шмат упрыгожанняў, пышных строяў і дурманячых напояў. Ён стаў перад ім і сказаў:

– Гэй, прыяцель, паслухай! Давай разам зладзім гулянку, павесялімся. Паглядзім на прыгажунь, паслухаем цудоўныя песні, паямо салодкія стравы. Гэй! Што ты там шэпчаш пра сябе?

– Адну таямніцу.

– Кінь дурное! Не будзем зараз псаваць задавальненне. Гэй, а што ў цябе ў руцэ?

– Адзін лячэбны сродак.

- Выкінь яго! Што з табой? Бо ты ж здаровы. А цяпер час для весялосці. Гэй, а што гэта за папера з пяццю знакамі?

– Адзін білет, адзін талон на мае харчы.

– Парві ўсё гэта! Навошта нам у гэты выдатны веснавы час выпраўляцца ў дарогу?.. – сказаў ён і ўсялякімі спакусамі імкнуўся пераканаць салдата. І гэты небарака нават

трохі паддаўся яму. Так, чалавек спакушаецца. Я таксама быў падмануты падобным інтрыганам.

Нечакана справа пачуўся падобны грому голас. «Сцеражыся! – сказаў ён. – Не спакушайся! І скажы таму інтрыгану: «Калі ў цябе ёсць які-небудзь спосаб выхаду з гэтага становішча, які б, знішчыўшы льва ззаду мяне, пазбавіўшы перада мной шыбеніцу і загаіўшы мае раны, вызваліў ад будучай дарогі, – калі ты знойдзеш такое выйсце, тады хай будзе па-твойму! Давай жа, зрабі, пакажы, паглядзім. А потым ужо кажы: «Давай павесялімся!». Інакш маўчы, каб сказаў свае слова гэты нябесны чалавек, падобны Хызыру...».

Такім чынам, душа мая, якая смяялася ў маладосці, а цяпер плача ад таго смеху, ведай жа! Тым няшчасным воінам з'яўляешся ты, чалавек. Той леў – гэта смяротны час. А тая шыбеніца – гэта пагібель, страта і расстанне: у кругазвароце дзён і начэй кожны сябар развітваецца з намі, сыходзіць у іншы свет. А тыя дзве раны: адна з іх – гэта цяжкая і бязмежная чалавечая бездапаможнасць, іншая – горкая, бязмежная чалавечая

беднасць. А той высылкай і шляхам з'яўляецца доўгая дарога выпрабаванняў, якая праходзіць праз Свет душ, мацярынскае ўлонне, маленства, старасць, праз наш свет, магілу, замагільны свет (Барзах), Судны дзень і мост Сырат.

А тыя дзве таямніцы – гэта вера ва Усявышняга і замагільны свет – Ахірат. З дапамогай гэтага святога талісмана смерць прыме аблічча пакорлівага каня Бурака, які панясе праведнага чалавека з вязніцы нашага свету ў райскія сады, да Міласцівага і Міласэрнага. І таму тыя дасведчаныя людзі, якія ўбачылі ісціну смерці, любілі яе і жадалі памерці яшчэ да яе прыходу. Да таго ж плыня часу, якая суправаджаецца гібеллю і расстаннем, смерцю і стратай, з'яўляецца той шыбеніцай, з дапамогай талісмана веры звернецца ў сродак для прыемнага сузірання і назірання новых, шматколерных і разнастайных цудаў мастацтва велічнага Творцы, дзівосных стварэнняў Яго магутнасці і праяў Яго ласкі. Так, змяняючыся, новыя люстэркі, якія праяўляюць колеры ў святле сонца, і змены на кінаэкране будуць утвараць яшчэ больш прыемныя, яшчэ больш вы-

датныя відарысы. А адзін з тых двух лячэбных сродкаў – гэта цярплівае спадзяванне на свайго Стваральніка, апора на Яго магутнасць, давер Яго мудрасці. Ці так гэта? Так, які ж страх можа быць у чалавека, які, спасылаючыся на сваю бездапаможнасць, абапіраецца на аднаго Уладара Сусвету, які валодае загадам كُنْ فَيَكُونُ *««Будзь!» - і яно бывае»* (Каран, 2:117 і інш.). Бо ён напярэдадні самага жудаснага няшчасця, сказаўшы: اِنَّا لِلّٰهِ وَاِنَّٓا اِلَيْهِ رَاجِعُونَ *«Сапраўды, мы належым Аллаху і да Яго мы вяр*таемся!» (Каран, 2:156) – з верай у сэрцы спадзявайся на свайго Міласэрнага Госпада. Так, праведныя святыя людзі, якія ведаюць Усявышняга, атрымліваюць задавальненне ад сваёй бездапаможнасці, ад боязі перад Ім. Так, у страху ёсць свая асалода. Калі ў якога-небудзь аднагадовага дзіцяці меўся б розум, і ў яго б спыталі: «Калі табе лепш і прыемней за ўсё?» – то ён, па ўсёй верагоднасці, адказаў бы: «Тады, калі я, разумеючы сваю бездапаможнасць і слабасць, баючыся салодкіх плескачоў сваёй мамы, прытуляюся да яе добрых грудзей». Між тым ласка і пяшчота ўсіх маці

– гэта толькі водбліск праявы Божай міласэрнасці. І вось таму дасведчаныя людзі ў сваёй бездапаможнасці і боязі перад Аллахам знайшлі такую асалоду, што, максімальна адхіліласся ад сваіх сіл і магчымасцей, бяссіллем звярнуліся да Яго дапамогі, а бездапаможнасць і боязь зрабілі сваім заступнікам.

Іншым жа лячэбным сродкам з'яўляецца малітва, зварот да Усявышняга з удзячнасцю і задаволенасцю, давер міласці Міласэрнага карміцеля. Ці так гэта? Так, як беднасць і галеча могуць быць горкімі і цяжкімі для госця Шчодрага Міласцівага Госпада, Які стварыў усю паверхню зямлі абрусам міласці, а вясну – букетам кветак, раскіданых па тым абрусе? Наадварот, ён будзе імкнуцца да павелічэння сваёй беднасці і нястачы, якія стануць прыемнымі пачуццямі. Вось таму людзі, якія дасягнулі дасканаласці, ганарыліся беднасцю. Аднак не зразумей няправільна! Гэта значыць – маліць Усявышняга, адчуваючы перад Ім сваю беднасць. Але гэта не азначае паказваць сваю беднасць людзям, займаць пазіцыю жабрацтва. А тым білетам, дакументам з'яўляецца выкананне абавязковых рэлігійных прадпісанняў

(фарз), і ў першую чаргу – намазу, а таксама пазбягання вялікіх грахоў. Ці так гэта? Так, згодна з усімі прарокамі і святымі, на працяглым і цёмным шляху да вечнасці правіянт, святло і Бурака можна здабыць, толькі прытрымліваючыся запаведзяў Карану і пазбягаючы здзяйснення недазволенага ім. Інакш навука і філасофія, мастацтва і мудрасць на тым шляху не будуць каштаваць ні манеты. Іх святло асвяціць наш шлях толькі да магілы...

Такім чынам, о, мая лянівая душа! Выконваць пяціразовы намаз, пазбягаць здзяйснення сямі вялікіх грахоў – наколькі гэта мала, зручна і лёгка. І ты ўсвядоміш, калі ў цябе ёсць розум і ён не пашкоджаны, наколькі значнымі, важнымі і вялікімі з'яўляюцца іх вынік, плён і карысць. А таму чалавеку і сатане, якія падахвочваюць цябе да здзяйснення граху і да распусты, скажаш:

«Калі маецца спосаб, які, знішчыўшы б смерць, ліквідаваў з гэтага свету пагібель і, пазбавіўшы чалавека ад бездапаможнасці і беднасці, закрыў бы шлях да магілы, у такім выпадку мы паслухаем цябе. А так маўчы!.. У Вялікай Мячэці свету Каран чытае Сусвет.

Паслухаем яго. Азарыўся гэтым Святлом. Будзем дзейнічаць з яго настаўленнем. Зробім яго пастаянна чытанай малітвай. Так, ён – Слова Госпада. Пра яго кажуць: «Выходзіць ад Усявышняга, з’яўляецца Праўдай, кажа Ісціну, паказвае яе і распаўсюджвае прамяніста мудрасць!..».

اَللّٰهُمَّ نَوِّرْ قُلُوبَنَا بِنُورِ الْاِيمَانِ وَ الْقُرْاٰنِ اَللّٰهُمَّ
اَغْنِنَا بِالْاِفْتِقَارِ اِلَيْكَ وَ لَا تُفْقِرْنَا بِالْاِسْتِغْنَاۤءِ
عَنْكَ تَبَرَّأْنَا اِلَيْكَ مِنْ حَوْلِنَا وَ قُوَّتِنَا وَ الْتَجَئْنَاۤ
اِلٰى حَوْلِكَ وَ قُوَّتِكَ
فَاجْعَلْنَا مِنَ الْمُتَوَكِّلِينَ عَلَيْكَ وَلَا تَكِلْنَاۤ اِلَى
اَنْفُسِنَا وَاحْفَظْنَا بِحِفْظِكَ وَارْحَمْنَا وَارْحَمِ
الْمُؤْمِنِينَ وَالْمُؤْمِنَاتِ وَصَلِّ وَسَلِّمْ عَلٰى سَيِّدِنَا
مُحَمَّدٍ عَبْدِكَ وَنَبِيِّكَ وَصَفِيِّكَ وَخَلِيلِكَ
وَجَمَالِ مُلْكِكَ وَمَلِيكِ صُنْعِكَ وَعَيْنِ عِنَايَتِكَ
وَشَمْسِ هِدَايَتِكَ وَلِسَانِ حُجَّتِكَ وَمِثَالِ

رَحْمَتِكَ وَنُورِ خَلْقِكَ وَشَرَفِ
مَوْجُودَاتِكَ وَسِرَاجِ وَحْدَتِكَ فِى كَثْرَةِ
مَخْلُوقَاتِكَ وَكَاشِفِ طِلْسِمِ كَٓائِنَاتِكَ وَ دَلَّالِ
سَلْطَنَةِ رُبُوبِيَّتِكَ وَمُبَلِّغِ مَرْضِيَّاتِكَ وَمُعَرِّفِ
كُنُوزِ اَسْمَٓائِكَ وَ مُعَلِّمِ عِبَادِكَ وَ تَرْجُمَانِ اٰيَاتِكَ
وَمِرْاٰتِ جَمَالِ رُبُوبِيَّتِكَ وَ مَدَارِ شُهُودِكَ وَ
اِشْهَادِكَ وَحَبِيبِكَ وَ رَسُولِكَ الَّذٖى اَرْسَلْتَهُ
رَحْمَةً لِلْعَالَمٖينَ وَ عَلٰٓى اٰلِهٖ وَ صَحْبِهٖٓ اَجْمَعٖينَ وَ
عَلٰٓى اِخْوَانِهٖ مِنَ النَّبِيّٖنَ وَ الْمُرْسَلٖينَ وَ عَلٰى
مَلٰٓئِكَتِكَ الْمُقَرَّبٖينَ وَ عَلٰى عِبَادِكَ الصَّالِحٖينَ
اٰمٖينْ

* * *

## Восьмае Слова

بِسْمِ اللّٰهِ الرَّحْمٰنِ الرَّحِيمِ

اَللّٰهُ لَٓا اِلٰهَ اِلَّا هُوَ الْحَىُّ الْقَيُّومُ ۞

اِنَّ الدِّينَ عِنْدَ اللّٰهِ الْاِسْلَامُ

*«У імя Аллаха Міласцівага, Міласэрнага. Аллах – няма бога, акрамя Яго, Жывога, які падтрымлівае жыццё»* (Каран, 3:2).

*«Сапраўды, рэлігіяй Аллаха з'яўляецца Іслам»* (Каран, 3:19).

Калі хочаш зразумець сутнасць і каштоўнасць гэтага света і чалавечай душы ў ім, а таксама рэлігіі ў чалавеку; і што, калі б не было Рэлігіі Ісціны, свет стаў бы астрогам; і што неверуючы чалавек з'яўляецца самым няшчасным стварэннем; і што раскрываюць загадку сусвету і пазбаўляюць чалавечую душу ад змроку словы يَا اللّٰهُ *«О, Аллах!»* і لَٓا اِلٰهَ اِلَّا اللّٰهُ *«Няма бога, акрамя Аллаха»*,

звярніся да гэтага параўнальнага аповеду, паслухай...

Неяк у далёкія часы адправіліся ў доўгае падарожжа два браты. Ішлі яны разам, пакуль дарога не раздвоілася. На ростанях яны ўбачылі аднаго старца і запыталіся ў яго: «Які шлях лепей?» І ён адказаў ім так: «На правым шляху вы павінны будзеце падпарадкоўвацца закону і парадку, аднак у гэтым абцяжарванні ёсць упэўненасць і шчасце. На левым жа шляху – свабода і незалежнасць, але ў той свабодзе ёсць небяспека і няшчасці. А цяпер выбар за вамі».

Выслухаўшы гэтыя словы, той з братоў, які меў добры нораў, сказаў: تَوَكَّلْتُ عَلَى اللّٰهِ *«Спадзяюся на Аллаха»*, – і пайшоў па правым шляху. Ён згадзіўся падпарадкоўвацца парадку і прытрымлівацца дысцыпліны. Другі ж брат, які быў распусны і разбэшчаны, толькі дзеля вольнасці аддаў перавагу леваму шляху. А зараз мы ў думках суправадзім гэтага чалавека, які адправіўся знешне ў лёгкім, але маральна ў цяжкім стане.

Дык вось, гэты чалавек, пераваліўшы праз горы і перайшоўшы даліны, з часам

выйшаў на пустынную раўніну. Раптам ён пачуў нейкі страшэнны рык. Азірнуўшыся, ён пабачыў, як страшны леў, выйшаўшы з гаю, кінуўся за ім. Падарожны ўцякаў ад яго, пакуль не натрапіў на высахлы калодзеж глыбінёю ў шэсцьдзесят аршынаў. Ад страху ён кінуўся туды. Пры падзенні на сярэдзіне калодзежа яго рукі выпадкова дакрануліся да сукоў нейкага дрэва, і ён ухапіўся за іх.

На сцяне калодзежа меліся два карані таго разлапістага дрэва. Дзве мышы, белая і чорная, накінуўшыся на гэтыя карані, грызлі іх. Ён паглядзеў уверх і пабачыў: леў, бы вартавы, пільнуе яго. Паглядзеўшы ж уніз, убачыў, што на дне ляжыць жудасны цмок, які падняў сваю галаву і наблізіў яе да яго ног, што былі ў трыццаці аршынах ад дна. Пашча ж цмока была шырокая, як дно калодзежа. Паглядзеўшы на сцены, ён убачыў, што яны пакрытыя джалячымі атрутнымі пачварамі. А глянуўшы на дрэва, убачыў, што гэта смакоўніца. Аднак, на дзіва, на ёй раслі плады розных дрэў – ад арэха да граната.

І вось гэты чалавек з-за сваёй някемлівасці і неразумнасці не здагадваецца, што ўсё

гэта нездарма. Гэта не можа быць выпадковасцю. За ўсім гэтым хаваецца нейкая незвычайная таямніца. І ён не змог прыйсці да высновы, што існуе адзін, дужа вялікі Аўтар усіх гэтых спраў. Нягледзячы на тое, што цяпер яго сэрца, душа і розум у тайне рыдалі і прасілі ратунку ад такога цяжкага становішча, яго нафс-і аммара, як ні ў чым не бывала, прыкінуўся, што не разумее становішча, не слухаючы плачу душы і сэрца, падманваючы самога сябе, пачаў есці плады таго дрэва, быццам знаходзіўся ў якім-небудзь садзе. Між тым частка гэтых пладоў была атрутнай і шкоднай. У адным хадзісе аль-кудсі Усявышні запаведваў нам:

اَنَا عِنْدَ ظَنِّ عَبْدِى بِى *«Як Мяне спазнае Мой раб, такім жа чынам Я буду абыходзіцца з ім»*. І вось гэты злашчасны чалавек праз свае сапсаваныя ўяўленні і неразумнасць убачанае ўспрыняў як саму існіну. І падобна абышліся з ім самім. І абыходзяцца. І абыдуцца... І не паміраe, і не жыве – вось так ён пакутуе. А мы, пакінуўшы няшчаснага ў гэтых пакутах, вернемся, каб зразумець становішча другога брата.

І вось ідзе гэты дабраславёны разумны

чалавек па сваёй дарозе. Ён не ведае такіх цяжкасцяў, як яго брат. Справа ў тым, што ён праз сваю добрапрыстойнасць будзе думаць пра прыгожыя рэчы, марыць пра добрае, будзе сябрам самому сабе. Да таго ж ён не абцяжарвае сябе, як яго брат, і не церпіць пакутаў. Таму што ведае парадак і кіруецца ім – ён бачыць у гэтым палёгку. Ён свабодна працягвае свой шлях у спакоі і ўпэўненасці. І вось натрапіў ён на сад, у якім растуць цудоўныя кветкі і плады, але з-за адсутнасці догляду ёсць і брудныя, сапсаваныя рэчы. Яго брат таксама заходзіў у падобны сад, але з-за таго, што ён звяртаў увагу на рэчы, якія выклікалі агіднасць, ён, зусім не адпачыўшы, працягнуў свой шлях. А гэты ж, зрабіўшы па правілу: «Ва ўсім шукай добрае», зусім не стаў глядзець на брудныя рэчы. Як след скарыстаўся добрым, што было ў садзе, і, цудоўна адпачыўшы, адправіўся далей.

З цягам часу ён, як і яго брат, апынуўся на бяскрайняй раўніне. Раптам ён пачуў рык ільва, які кінуўся за ім. Ён спужаўся, але не настолькі, як яго брат, бо, дзякуючы свайму добраму погляду і добрай думцы, знайшоў суцяшэнне, палічыўшы: «У гэтага бяскрай-

няга прастору ёсць адзін Уладар. Мабыць, гэты леў з'яўляецца слугой таго Уладара». Але ўсё ж кінуўся наўцёкі. І кінуўся ў адзін калодзеж глыбінёю ў шэсцьдзесят аршынаў, які трапіўся на шляху. Як і ў яго брата, на сярэдзіне калодзежа яго рукі ўхапіліся за нейкае дрэва, і ён павіс на ім. Паглядзеўшы наўкола, ён убачыў, як дзве жывёліны грызуць два корані таго дрэва. Наверсе яго пільнаваў леў, а на дне калодзежа ляжаў цмок. Гэтак сама, як і яго брат, ён убачыў незвычайную сітуацыю і жахнуўся ад убачанага, аднак страх яго быў у тысячу разоў лягчэйшы за страх яго брата. Справа ў тым, што яго добрапрыстойнасць навяла яго на добрую думку. А добрая думка, добрае меркаванне ва ўсім паказваюць яму добры бок. І вось з гэтай прычыны ён разважаў так: «Гэтыя незвычайныя справы/рэчы звязаныя паміж сабою. Да таго ж яны быццам дзейнічаюць па адным загадзе. У такім выпадку за гэтымі справамі крыецца нейкая таямніца. Так, усё гэта адбываецца па загадзе аднаго ўтоенага Уладара. Значыцца, я не самотны. Той утоены Уладар назірае за мною, выпрабоўвае мяне. Ён запрашае мяне ў нейкае месца, накіроўваючы туды з нейкай мэтай».

І ад гэтай салодкай боязі і добрай думкі ў яго ўзнікла дапытлівасць: «Цікава, а хто ж Ён, які, выпрабоўваючы мяне, жадае паказаць Сябе і гэтым незвычайным шляхам вядзе мяне да нейкай мэты?».

Затым ад жадання пазнаць у яго з'явілася любоў да Уладальніка таямніцы. І ад гэтай любові ўзнікла імкненне раскрыць гэту таямніцу, а з-за гэтага імкнення з'явілася жаданне ўвайсці ў такі дабрадзейны стан, якім бы ён здабыў задаволенне Уладальніка таямніцы.

Затым ён зірнуў на дрэва і ўбачыў, што гэта смакоўніца. Аднак на ёй раслі плады тысяч разнастайных дрэў. Тады страх яго зусім знік, таму што ён цвёрда зразумеў: тая смакоўніца – гэта меню, каталог, выстаўка! Пэўна, утоены Уладар з нейкім сэнсам цудоўным чынам павесіў на гэта дрэва ўзоры пладоў са свайго саду і ўпрыгожыў яго, зрабіўшы прадвесцем пачастунку, прыгатаванага Ім для сваіх гасцей. Інакш адно-адзінюткае дрэва не дасць пладоў тысяч разнастайных дрэў.

Пасля гэтага ён пачаў так маліцца і прасіць, што ключ да разгадкі таямніцы раскрыў-

ся яму. Ён заклікаў:

«О, Уладару гэтых мясцін! Мой лёс у Тваіх руках. Шукаю ратунку ў Цябе і Табе скараюся. Прашу Тваёй згоды і шукаю Цябе».

Пасля гэтага малення сцяна калодзежа раптам раскалолася, і расчыніліся дзверы ў дзіўны, чароўны, бездакорна цудоўны сад. Пашча цмока ператварылася ў гэтыя дзверы. А леў і цмок прынялі выгляд двух слуг, запрашаючы яго ўвайсці ў сад, затым леў ператварыўся для яго ў паслухмянага каня.

Дык вось, о, мая лянівая душа і мой уяўны спадарожнік! Давайце параўнаем становішчы гэтых двух братоў, каб убачыць і зразумець, як дабро прыносіць дабро і як зло спараджае зло.

Дык вось, злашчасны падарожны левай дарогі чакае ў любы момант апынуцца ў пашчы цмока, дрыжыць ад страху. А гэтага шчаслівага падарожнага запрашаюць ў пладаносны і раскошны сад. Сэрца таго няшчаснага раздзіраюць горкі жах і страх. А гэты шчаслівы ў салодкай боязі назірае дзівосныя з'явы, з любоўю пазнаваючы іх і атрымліваючы карысны ўрок. Акрамя таго, той няшчасны пакутуе ў дзікасці, адчаі і са-

моте. А гэты шчаслівы цешыцца зносінамі, надзеяй і чаканнем. Той няшчасны адчувае сябе ў становішчы вязня, на якога накінуліся лютыя звяры. А шчаслівы – быццам дарагі госць, які гасцюе ў Шчодрага Гаспадара і жартуе з Яго незвычайнымі слугамі, бачачы ў іх сяброў. Акрамя таго, той злашчасны, ужываючы знешне салодкія, але па сутнасці атрутныя плады, паскарае прыход сваіх пакут. Бо тыя плады – узоры. Дазвол пакаштаваць іх маецца, каб ён, жадаючы і дамагаючыся іх арыгіналаў, стаў іх пакупніком. Дазволу ж паглынаць іх, як жывёла, няма. А гэты шчаслівы пакаштуе іх, зразумее, у чым справа, адтэрмінуе іх ужыванне і будзе цешыцца чаканнем. Той няшчасны змучыў, змардаваў самога сябе. Светлую, як дзень, ісціну і ясную сітуацыю сваёй непрадбачлівасцю абярнуў для сябе ў цёмныя і змрочныя боязь і фантазію, у вобраз апраметнай. І не заслугоўвае ён спачування, і не мае права ні на каго скардзіцца.

Напрыклад, калі чалавек, знаходзячыся летам у раскошным садзе сярод сваіх сяброў, не здавольваючыся асалодамі за прыемным святочным частаваннем, ап'яніць сябе пага-

нымі дурманлівымі напоямі, пасля гэтага ўявіць, бы знаходзіцца сярод звяроў у зімовую пару галодным і няшчасным, пачне рыдаць і галасіць – ён не будзе заслугоўваць спачування... Ён мучыць самога сябе. Прымаючы сваіх сяброў за звяроў, абражае іх. Дык вось, і той няшчасны падобны да яго. Шчаслівы ж убачыў ісціну, і ісціна цудоўная. Са спасціжэннем яе прыгажосці ён стане шанаваць дасканаласць Уладальніка Ісціны і будзе вартым Яго ласкі.

Такім чынам, раскрываецца таямніца адной з запаведзяў Карану: «Зло знай ад сябе, дабро – ад Аллаха». І калі супаставіш іншыя падобныя адрозненні, то зразумееш, што нафс-і аммара першага падрыхтаваў яму духоўнае пекла. А шчырасць і добры склад думак, прыстойнасць і добрыя развагі другога брата ўганаравалі яго вялікай ласкі і дабрабыту, а таксама бліскучай дабрачыннасці і багацця.

О, мая душа, і чалавек, што слухае гэты аповед разам са мною!

Калі не жадаеш быць няшчасным братам і хочаш стаць шчаслівым, то слухай Каран і падпарадкоўвайся яго запаведзям! І вазьмі-

ся за яго! І дзейнічай па яго наказах!..

Калі ты зразумееў ісціны, што маюцца ў гэтым параўнаўчым аповедзе, то рэчаіснасць нашага навакольнага свету, рэлігіі, чалавека і веры (імана) зможаш прыстасаваць да гэтага прыкладу. Неабходнае я табе раскрыю, а ў тонкасцях разбярыся сам.

Дык вось, глядзі! Адзін з двух братоў – душа богабаязнага і сэрца праведнага; другі ж – душа неверуючага і сэрца сапсаванага чалавека. Правая з тых двух дарог – шлях Карану і веры, левая – шлях непакорнасці Госпаду і непрызнання Божай міласці. Садам жа на той дарозе з'яўляецца мімалётнае жыццё ў чалавечым грамадстве і цывілізацыі, у якой побач суіснуюць дабро і зло, добрае і дрэннае, чыстае і бруднае. Разважлівы той, хто будзе рабіць па правілу:

-*Вазьмі добрае, не ча«* خُذْ مَا صَفَا دَعْ مَا كَدَرُ *пай дрэннае»*, і пойдзе з жыцця з выратаваным сэрцам.

А тая неабсяжная раўніна – гэта Зямля і свет. Той леў – гэта пагібель і смерць. Калодзеж жа – гэта цела чалавека і час жыцця. А тыя шэсцьдзесят аршынаў глыбіні

паказваюць на шэсцьдзесят гадоў – сярэднюю, верагодную працягласць жыцця чалавека. Тое дрэва – гэта перыяд жыцця, аснова і сродкі яго існавання. Белая і чорная мышы – гэта дзень і ноч. Цмок – парог Таго свету і шлях Барзаха, пачаткам якога з'яўляецца магіла – пашча цмока. Аднак для веруючага, набожнага чалавека гэта пашча – дзверы з цямніцы ў сад. Тыя шкодныя стварэнні – гэта нашы зямныя беды і нягоды. Але для праведнага, богабаязнага чалавека яны ёсць добрая Божая перасцярога і знак прыхільнасці Міласэрнага Госпада, каб не ўпасці ў сон бесклапотнасці. А плады на тым дрэве – гэта зямныя даброты, якія Вялікі Міласцівы Аллах стварыў у выглядзе пераліку дабротаў Таго свету, іх вестуноў, іх падабенстваў у выглядзе ўзораў райскіх пладоў, якія запрашаюць тых, хто жадае іх. І нягледзячы на адзінкавасць гэтага дрэва, яно дае разнастайныя плады, што паказвае на пячатку Божай Магутнасці, Праўлення і Панавання.

Справа ў тым, што з адной рэчы стварыць усе, г. зн. з адной зямлі вырошчваць разнастайныя расліны і плады, з адной вады

стварыць усіх жывёл, з адной простай ежы ствараць усе органы жывой істоты; і разам з гэтым усе рэчы ствараць адзінай рэччу, г. зн. з дужа разнастайнай ежы, якую ўжываюць істоты, ствараць для кожнай з іх адзін, уласцівы выключна яму арганізм і ткаць аднародную жывую тканіну, і іншыя падобныя майстэрствы – гэта ўнікальная пячатка Цара Спрадвечнасці і Вечнасці (Султан-і Азаль і Абад) – Адзінага (Ахад) і Самадастатковага (Самад), якая непадробная і ўласцівая толькі Яму. Так, адзінае ствараць усім і ўсё ствараць адзіным – гэта знак, характэрны выключна для Творцы ўсіх рэчаў і Магутнага над усялякай рэччу. А той загадкай з'яўляецца патаемны сэнс стварэння, які раскрываецца сакрэтам іману (веры). А той ключ – гэта:

يَٓا اَللّٰهُ ۞ لَٓا اِلٰهَ اِلَّا اللّٰهُ ۞

اَللّٰهُ لَٓا اِلٰهَ اِلَّا هُوَ الْحَىُّ الْقَيُّومُ

*«О Аллах! Няма бога, акрамя Аллаха! Аллах – няма бога, акрамя Яго, Жывога, які падтрымлівае жыццё (Каюм)».*

Ператварэнне пашчы цмока ў браму сада паказвае на наступнае: хаця магіла і з'яўляецца для аблудных і бязбожных людзей дзвярыма, якія ў жаху і забыцці адчыняюцца ў панурую і цесную, як чэрава цмока, вязніцу, але для паслядоўнікаў Карану і людзей веры яна – дзверы, якія раскрываюцца з цямніцы гэтага свету ў сады вечнасці, з арэны выпрабаванняў – у райскія сады, ад цяжару зямнога жыцця – да ласкі Міласэрнага.

Ператварэнне лютага ільва ў ветлівага слугу і затым у паслухмянага каня паказвае, што, хаця для аблудных смерць – гэта горкая вечная разлука з усімі сваімі любімымі і блізкімі, а акрамя таго, арышт і зняволенне ў вязніцы магілы ў страху і адзіноце з выгнаннем са свайго ўяўнага зямнога раю, для людзей шляху ісціны і паслядоўнікаў Карану смерць – магчымасць для ўз'яднання са старымі сябрамі і блізкімі, што пайшлі ў свет іншы, і спосаб для ўваходжання на іх сапраўдную радзіму і на вечныя землі шчасця, і запрашэнне ўвайсці ў райскія сады, пакінуўшы цямніцу гэтага свету, і чарга атрымаць Божай ласкай і шчодрасцю Мілас-

цівага, Міласэрнага Аллаха ўзнагароджанні, якія адпавядаюць свайму служэнню, і вызваленне ад цяжару прыжыццёвых абавязкаў, і завяршэнне вучэння і выпрабаванняў жыцця і пакланення Усявышняму...

Адным словам, любы чалавек, які паставіў сабе галоўнай мэтай гэта тленнае жыццё, нават калі ён знешне будзе жыць у некім раі, духоўна будзе ў пекле. А той, хто сур'ёзна накіраваны на вечнае жыццё, дасягне шчасця ў абодвух светах. Наколькі б цяжкім і горкім ні было яго жыццё, з той прычыны, што ён разглядае і ўсведамляе гэты свет у якасці залы чакання Рая, ён знойдзе яго цудоўным, вытрымае ўвесь яго цяжар і ў цярплівасці будзе дзякаваць Усявышняму...

اَللّٰهُمَّ اجْعَلْنَا مِنْ اَهْلِ السَّعَادَةِ وَ السَّلَامَةِ وَ الْقُرْاٰنِ وَ الْاِيمَانِ اٰمِينْ

اَللّٰهُمَّ صَلِّ وَ سَلِّمْ عَلٰى سَيِّدِنَا مُحَمَّدٍ وَ عَلٰى اٰلِهِ وَ صَحْبِهِ بِعَدَدِ جَمِيعِ الْحُرُوفَاتِ الْمُتَشَكِّلَةِ فِى جَمِيعِ الْكَلِمَاتِ الْمُتَمَثِّلَةِ بِاِذْنِ الرَّحْمٰنِ فِى

مَرَايَا تَمَوُّجَاتِ الْهَوَاءِ عِنْدَ قِرَآئَةِ كُلِّ كَلِمَةٍ مِنَ
الْقُرْاٰنِ مِنْ كُلِّ قَارِءٍ مِنْ اَوَّلِ النُّزُولِ اِلٰى اٰخِرِ
الزَّمَانِ وَ ارْحَمْنَا وَ وَالِدَيْنَا وَارْحَمِ الْمُؤْمِنِينَ
وَالْمُؤْمِنَاتِ بِعَدَدِهَا بِرَحْمَتِكَ يَا اَرْحَمَ
الرَّاحِمِينَ اٰمِينَ وَالْحَمْدُ لِلّٰهِ رَبِّ الْعَالَمِينَ

* * *

## Дзевятае Слова

بِسْمِ اللّٰهِ الرَّحْمٰنِ الرَّحِيمِ

فَسُبْحَانَ اللّٰهِ حِينَ تُمْسُونَ وَحِينَ تُصْبِحُونَ ۞ وَلَهُ الْحَمْدُ فِى السَّمٰوَاتِ وَالْاَرْضِ وَعَشِيًّا وَحِينَ تُظْهِرُونَ

«*У імя Аллаха, Міласцівага, Міласэрнага! Хвала ж Аллаху, калі заспявае вас вечар і калі заспявае раніца! Яму хвала і ў нябёсах, і на зямлі, і ўвечары, і апоўдні!*» (Каран, 30:17-18).

Браце мой! Ты пытаешся ў мяне пра сэнс ўстанаўлення пэўнага часу для здзяйснення пяціразовага намазу. З усёй багатай колькасці сэнсаў тут мы адлюструем толькі адзін з іх.

Так, таму што час кожнага з пяці намазаў – пачатак важнага пераходнага стану, так і ў сувязі з тым, што ён з'яўляецца грандыёзным люстэркам Божага распараджэння і адлюстраваннем усіх Божых ласкаў у гэтым распараджэнні, у гэтыя часы загадана здзяй-

сняць намаз, што азначае яшчэ больш у гэтыя гадзіны ўзвялічваць Усемагутнага, дзякаваць і ўзносіць Яму падзяку за ўсе незлічоныя выгоды, атрыманыя ў прамежку паміж двума намазамі. Каб у некаторай ступені зразумець гэты тонкі і глыбокі сэнс, неабходна паслухаць разам са мной наступныя пяць таямніц:

**ПЕРШАЯ ТАЯМНІЦА.**

Сэнс намазу – праслаўляць (тасбіх), узвялічваць (тазім) і дзякаваць (шукур) Усявышняга; што азначае, пакланіцца перад Яго Магутнасцю, словам і дзеяннямі прамаўляючы «Субханаллах», праслаўляць Яго... І схіліцца перад яго дасканаласцю, духоўна і фізічна кажучы «Аллаху Акбар», узвялічваць Яго... і схіліцца перад яго Прыгажосцю, выказваючы сэрцам, мовай і целам «Альхамдуліллях», дзякаваць Яго... Атрымліваецца, услаўленне, узвялічванне і падзяка выступаюць у якасці асноў намазу. Вось таму тры пералічаныя асновы прысутнічаюць ва ўсіх рухах і формулах намазу. І ў сувязі з гэтым пасля здзяйснення намазу, каб умацаваць і замацаваць яго сэнс, дадзеныя святыя словы паўтараюцца па трыццаць тры

разы. Сэнс намазу замацоўваецца гэтымі кароткімі асновамі.

## ДРУГАЯ ТАЯМНІЦА.

Сэнс пакланення заключаецца ў наступным: паўстаўшы перад Госпадам, разумеючы свае недахопы, бездапаможнасць і беднасць, з пакланеннем і любоўю здзейсніць перад Яго Божай дасканаласцю, магутнасцю і міласцю саджда (зямны паклон), г.зн. падобна таму, як уладарства Божага Клопату патрабуе глыбокай пашаны і падпарадкавання, гэтак жа Яго святасць і дасканаласць патрабуюць, каб раб Божы, бачачы свае ўласныя памылкі і недахопы, молячы Усявышняга аб прабачэнні грахоў, тасбіхам і святым словам «Субханаллах» абвясціў аб тым, што яго Гасподзь чысты, святы і далёкі ад усіх заган, ад ілжывых і недарэчных меркаванняў аблудных і ад усіх недахопаў і заган гэтага свету.

Пры гэтым абсалютная магутнасць Уладарання патрабуе, каб раб Божы, разумеючы ўласную слабасць, а таксама бездапаможнасць усяго стварэння, у здзіўленні і захапленні перад веліччу адзнак Божай магутнасці, прамовіўшы «Аллаху Акбар», з пакорай

здзейсніўшы паясны паклон, звярнуўся да Яго дапамогі і спадзяваўся на Яго.

Акрамя таго, невычэрпная скарбніца міласці Божага Клопату патрабуе, каб паважлівы раб малітвамі і просьбамі выказаў свае ўласныя патрэбы, а таксама патрэбу і патрэбы ўсіх стварэнняў, і ўдзячнасцю і ўсхваленнем, а таксама святым словам «Альхамдуліллях» абвясціў пра ласку і дабрачынствы свайго Госпада. Такім чынам, рухі, што выконваюцца падчас намазу, прамоўленыя святыя словы і чытаныя малітвы складаюць у сабе вышэйпаказаныя сэнсы і таму ўстаноўлены Богам.

## ТРЭЦЯЯ ТАЯМНІЦА.

Падобна да таго, як чалавек з'яўляецца паменшаным прыкладам вялікага сусвету, а дабраславёная сура «Фаціха» – светлым увасабленнем Вялікага Карану, так і намаз з'яўляецца зіхоткім зместам, які ўключае ў сябе разнастайныя віды глыбокай пашаны, і святой схемай, што паказвае розныя віды пакланення ўсякага кшталту стварэнняў.

## ЧАЦВЁРТАЯ ТАЯМНІЦА.

Падобна да таго, як у тыднёвых гадзінніках стрэлкі, што вылічаюць секунды,

хвіліны, гадзіны і дні, будуць залежаць адзін ад аднаго, з'яўляцца прыкладамі і займаюць пазіцыі адзін аднаго, так і кругазварот дзён і начэй, які знаходзіцца на пазіцыі секунды нашага сусвету, падобнай да вялікага гадзінніка Усявышняга, і гады, што адлічваюць хвіліны гэтых гадзін, і этапы чалавечага жыцця, што адлічваюцца гадзінамі, і эпохі ў жыцці сусвету, што вылічваюць дні, будуць залежаць адзін ад аднаго, займаць пазіцыі і нагадваюць адзін аднаго. Напрыклад:

- **Час фаджр** (світанак, да ўзыходу сонца) будзе пахадзіць на пачатак вясны і на імгненне, калі чалавек трапляе ў мацярынскае ўлонне, і на першы з шасці дзён стварэння нябёсаў і зямлі. І нагадае нам пра Божыя дзеі ў іх.

- **Час зухр** (гадзіна апоўдні) будзе нагадваць і паказваць на сярэдзіну лета, на спелую маладосць, на эпоху ў жыцці сусвету, калі быў створаны чалавек. І нагадае пра праявы Божай ласкі і пра багацце ў іх Божых дабротаў.

- **Час аср** (другая палова дня да заходу сонца) будзе нагадваць восень, і пра прыход старасці, і пра Стагоддзе Шчасця – час жыц-

ця апошняга Прарока (свет яму і дабраслаўленне Усявышняга). І нагадае пра Божыя дзеі і міласць у іх.

• **Час магрыб** (пасля заходу сонца) з напамінам пра знікненне ў канцы восені вельмі многіх стварэнняў, пра смерць чалавека, пра заняпад перад разбурэннем свету пакажа на праявы Божай магутнасці і Велічы і абудзіць чалавека са сну бестурботнасці, асцеражэ яго...

• **Час іша** (час надыходу ночы) нагадае чалавеку пра пакрытую чорным саванам свету цемры ўсяго стварэння дзённага свету і пра ахутанае аблічча памерлай зямлі белым саванам зімовага часу, і пра скрыццё ў імгле забыцця апошніх слядоў чалавека, які пайшоў у іншы свет, а таксама пра поўнае згасанне гэтага маркотнага свету, які з'яўляецца арэнай выпрабаванняў. Абвесціць пра велічнае распараджэнне Усемагутнага Аллаха.

• **Начны ж час**, апавяшчаючы пра зіму, пра магілу, пра свет Барзах, нагадае чалавеку, у якой ступені мае патрэбу чалавечая душа ў міласці Усявышняга Міласэрнага Госпада.

• **Тахаджуд** у начны час апавясціць і нагадае чалавеку пра тое, наколькі неабходным святлом з'яўляецца ён у змроку магілы і ў імгле Барзаха. І з напамінам унутры ўсіх гэтых паваротаў і пераходаў пра бясконцыя дабрачынствы Вялікага Праўдзівага Дабрадзея абвесціць, у якой ступені Ёнварты падзякі і ўсхваленняў.

• **Другая ж раніца** нагадае пра раніцу Хашыра – Дзень уваскрашэння з мёртвых. Так, наколькі відавочны, неабходны і бясспрэчны надыход раніцы пасля гэтай ночы і вясны пасля гэтай зімы, настолькі ж вызначаным з'яўляецца і раніца Хашыра, і вясна Барзаха.

Такім чынам, падобна таму як кожны з пяці часоў здзяйснення намазу знаходзіцца на чале значнага пераходнага стану і нагадвае пра вялікія ператварэнні, такім жа чынам і знакамі вялікіх штодзённых распараджэнняў Божай магутнасці ён нагадае пра гадавыя, векавыя і эпахальныя цуды магутнасці і дарункаў Божай ласкі. Значыць, фарз-намаз, галоўны натуральны абавязак чалавека, аснова глыбокай пашаны і безумоўны абавязак, у пэўны для яго час

дарэчны і мэтазгодны.

**ПЯТАЯ ТАЯМНІЦА.**

Чалавек па сваёй прыродзе досыць слабы. Між тым ёсць шмат чаго, што закранае і засмучае яго, прычыняе яму боль. Да таго ж ён вельмі бездапаможны, бед і ворагаў у яго шмат. Ён вельмі бедны, а яго патрэбы вялікія. Да таго ж ён гультаяваты і нямоглы, а цяжар жыцця вельмі вялікі. Чалавечнасць звязала яго з усім светам, а між тым расстанне і страта каго або чаго-небудзь любімага, каханага і блізкага пастаянна раніць яго, прычыняе боль. Розум паказвае яму высокія мэты і вечны плён, але яго рукі кароткія, жыццё хуткабежнае, а сіл і цярплівасці мала.

І вось пры такім становішчы чалавечай душы зусім ясна, наколькі неабходным з'яўляецца на **досвітку** (фаджр) звярнуцца да абіцелі Усемагутнага і Міласэрнага маленнем і намазам, прасіць у Яго дапамогі і падтрымкі, наколькі гэта неабходная апора для таго, каб вытрымаць цяжар спраў і абавязкаў, якія наваляцца на чалавека ў дзённы час.

**Апоўдні** (зухр) – гэта час сярэдзіны дня і пачатак яго сыходу да вечара, час, калі дзён-

ныя работы дасягаюць свайго піку, час кароткага адпачынку ад бясконцых спраў і клопатаў, час патрэбы душы ў перапынку ад духоўнай бестурботнасці і пустэчы, якія ўсяляюць часовыя і цяжкія справы гэтага тленнага свету, а таксама час праявы Божай ласкі. І вось тады, вызваляючыся ад прыгнёту побыту, пазбаўляючыся ад духоўнай бестурботнасці і пустэчы, адышоўшы ад бессэнсоўных і тленных рэчаў, паважна і пакорліва апынуўшыся перад Сапраўдным дабрадзем і карміцелем, Нязменна Вечным, дзякуючы і ўсхваляючы Яго за ўсе даброты, прасіць аб дапамозе і выказаць паясным паклонам сваё бяссілле перад Яго Магутнасцю і Веліччу, аб'явіць, здзяйсняючы перад Яго непераходзячай дасканаласцю і бяспрыкладнай Прыгажосцю зямныя паклоны, выказваючы сваё захапленне, любоў і пакору – гэта і значыць здзейсніць у гэты час паўдзённы намаз. І ты, вядома, усвядоміш, наколькі гэта прыемна, неабходна і мэтазгодна...

**Пасляпаўдзённы час** (аср) нагадае і будзе падобным і на маркотную восень, і на бязрадасны старэчы стан, і на журботны перыяд

перад гібеллю свету. Гэты час завяршэння дзённых работ, час, калі падводзіцца вынік такіх Божых дабротаў, як здароўе, дабрабыт і добрыя справы, якія атрымаў чалавек у гэты дзень; час калі велічнае сонца хіліцца да заходу і кажа нам пра тое, што чалавек з'яўляецца госцем, і што ўсё ў гэтым свеце часова і непастаянна. Чалавечая ж душа жадае вечнасці, яна створана для яе, схіляецца перад ласкаю і пакутуе ад расстанняў. І вось у гэты час, здзейсніўшы абмыванне для здзяйснення пасляпаўдзённага намазу, узносячы мальбу, звяртаючыся да абцелі Беспачатнага і Бясконцага Аллаха – Вечна Існага, звяртаючыся па дапамогу да добразычлівасці Яго вечнай і бязмежнай Міласэрнасці, дзякуючы і ўсхваляючы Яго за незлічоныя выгоды, здзейсніўшы паклон перад магутнасцю яго ўладарання і пакорліва ўпаўшы ніцма перад яго Божай Нязменнасцю, знаходзячы сапраўднае суцяшэнне і знаходзячы душэўны спакой, пачціва і пакорліва паўстанем перад Ім, перад яго Велічнасцю і Грандыёзнасцю – гэта і азначае здзейсніць пасляпаўдзённы намаз. І той, хто з'яўляецца сапраўдным чалавекам, несум-

ненна зразумее, наколькі гэта святы і мэтазгодны абавязак.

**Вячэрні час** (магрыб) нагадае пра той час, калі з сумным развітаннем знікаюць з прыходам зімы вытанчаныя і цудоўныя стварэнні царства лета і восені; і калі з прыходам сваёй смерці чалавек, у журботным расстанні, развітаўшыся з усімі сваімі любімымі, сыходзіць у магілу. Гэта нагадае і будзе падобна на той час, калі са смерцю гэтага свету ў страсеннях перадсмяротнай агоніі ўсе яго жыхары пяройдуць у іншы свет, і згасне агмень гэтага месца выпрабаванняў. Гэта і час, які строга перасцерагае тых, хто празмерна прывязаны да сваіх любімых, якія пакідаюць нас і знікаюць. Такім чынам, для здзяйснення вячэрняга намазу чалавечая душа, якая з'яўляецца люстэркам Вечна Прыгожага, звярнуўшыся да Аршу Велічы Пастаянна Існага (Кадзіма-і Ламйезаль) і Вечна Нязгаснага (Бакі-і Лаезаль), Які здзейсніў усе гэтыя вялікія дзеі, кіруе грандыёзнымі сусветамі і змяняе іх, сказаўшы над усім гэтым смяротным «Аллаху Акбар» і адсунулася ад усяго тленнага, склаўшы рукі перад сабой дзеля служэння Госпаду, пач-

ціва і пакорліва апынуўшыся перад Пастаянна Вечным, дабраславёным словам «Альхамдуліллях» дзякуючы і ўсхваляючы Яго бездакорную Дасканаласць, непаўторную Прыгажосць і бязмежную Ласку, і сказаўшы: اِيَّاكَ نَعْبُدُ وَ اِيَّاكَ نَسْتَعِينُ *«Табе мы пакланяемся і Цябе просім дапамагчы»* (Каран, 1:5), выказаўшы сваю пакору перад яго Боскасцю і Уладараннем, якія не маюць патрэбы ні ў дарадцах, ні ў партнёрах, будзе прасіць аб дапамозе; здзейсніўшы паклон перад Яго бязмежнай Веліччу, бязмежнымі Перавагамі і Магутнасцю, выказаўшы разам з усім існым сваю слабасць і бездапаможнасць, беднасць і мізэрнасць, сказаўшы: سُبْحَانَ رَبِّىَ الْعَظِيم *«Хвала далёкаму ад усіх недахопаў і заган майму Вялікаму Госпаду»*, славячы і ўзвялічваючы Яго, здзейсніўшы зямны паклон перад непераходзячай Прыгажосцю Яго Сутнасці, перад Яго нязменнымі святымі якасцямі і непарушнай Чароўнай дасканаласцю, у пакоры і захапленні забыўшыся пра ўсё зямное, абвясціўшы сваю любоў і пакору Усявышняму, набыўшы ўзамен за ўсё пераходзячае і часовае аднаго

Вечна Прыгожага, аднаго Пастаянна Міласэрнага і сказаўшы: سُبْحَانَ رَبِّىَ الْاَعْلٰى *«Хвала Госпаду майму, Які вышэй за ўсё»*, – услявіць свайго Вялікага, несмяротнага і святога Госпада, і абвесціць аб адсутнасці ў Яго недахопаў...

Затым, молячыся седзячы, узносячы ад свайго імя Нясгаснаму Чароўнаму (Джаміль-і Ламйезаль) і Нязгасна Велічнаму (Джаліль-і Лаезаль) дабраславёныя прывітанні і паклоны, добрыя звароты і малітвы ўсіх стварэнняў і вітаючы яго Найшаноўнага Пасланца, абновіць сваю прысягу на вернасць, выкажа сваё падпарадкаванне яго запаведзям; асвятліўшы сваю веру абнаўленнем і назіраючы мудры парадак гэтага палаца сусвету, будзе сведчыць пра адзінасць Усемагутнага Творцы і пра прароцтва Мухаммада (мір яму і дабраслаўленне Аллаха), які з'яўляецца вешчуном і дабраславёным веснікам Уладарання Усявышняга і выразнікам азнакаў Вялікай Кнігі Сусвету – гэта і значыць здзейсніць вячэрні намаз.

Праўдзівы чалавек, безумоўна, усведамляе, наколькі гэта ўзнёслы і цнатліва чысты

абавязак, наколькі гэта святое, прыемнае служэнне і пакланенне, наколькі сур'ёзная ісціна, а таксама якія несмяротныя зносіны і пастаяннае шчасце ў гэтым часовым, тленным свеце!..

**Начны час**, калі са знікненнем апошніх слядоў дня, якія засталіся на гарызонце, начны свет накрывае зямлю, нагадае пра Магутнага Уладальніка Велічы (Кадыр-і Зульджаляль), مُقَلِّبُ اللَّيْلِ وَ النَّهَارِ *«Які змяняе дзень і ноч»*, Які Сваімі Божымі распараджэннямі перагортвае белую старонку на чорную, і нагадае пра Божыя дзеянні Мудрага Уладальніка Дасканаласці (Хакім-і Зулькамаль), які مُسَخِّرُ الشَّمْسِ وَ الْقَمَرِ *«Загадвае сонцам і месяцам»* і перагортвае размаляваную зялёную старонку лета на халодную і белую старонку зімы.

І нагадае пра Божыя дзеянні «Стваральніка смерці і жыцця», якія заключаюцца ў перасяленні з цягам часу памерлых і тых, што засталіся пасля іх, у іншы свет.

А таксама гэты час нагадае пра велічнае кіраванне і праяве прыгажосці «Творцы Зямлі і Нябёсаў» у перадсмяротнай агоніі,

канчатковым разбурэнні гэтага цеснага, тленнага і нікчэмнага свету і ў раскрыцці шырокага, велічнага і пастаяннага Замагільнага свету. Сапраўдным Гаспадаром (Малік) і Кіраўніком (Мутасаррыф), Годным пакланення (Мабуд) і Узлюбленым (Махбуб) у гэтым сусвеце зможа быць толькі той, хто лёгка, нібы перагортваючы старонкі якой-небудзь кнігі, будзе змяняць, пісаць, сціраць, змяняць ноч і дзень, зіму і лета, зямны і замагільны свет. Гэта палажэнне даказвае, што над усім уладарыць адзін Абсалютна Усемагутны (Кадыр-і Мутлак).

Такім чынам, бясконца слабая і бяссільная, бясконца бедная чалавечая душа, якая жыве ў нястачы, пагружаная ў цемру неабсяжнай будучыні, якая б'ецца сярод незлічоных падзей, для здзяйснення «Ятсы» намазу з такім сэнсам, сказаўшы падобна Ібрахіму (Аўрааму, мір яму): لَا أُحِبُّ الْآفِلِينَ *«Не люблю я тых, хто знікае...»* (Каран, 6:76), – звярнуўшыся з намазам да абіцелі Бясконца Любімага (Махбуба-у Лаезаль), Вечна Годнага Пакланення (Мабуд-у Ламйезаль), любоў да Якога нязгасна; у гэтым тленным свеце, у гэтым часовым жыцці, у гэтай змрочнай рэ-

чаіснасці і цёмнай будучыні молячыся Аднаму Вечнаму і нязменнаму (Бакі-і Сармадзі); убачыўшы добразычлівасць Міласці і святло прамога Шляху Усяміласцівага і Міласэрнага (Рахман-і Рахім), якія ў часцінцы вечнай гутаркі і ў некалькіх хвілінах вечнага жыцця пральюць святло на яе сусвет, азораць яе будучыню і стануць бальзамам для яе ран, якія з'явіліся ад расстанняў з любімымі і ўсімі істотамі і ад іх пагібелі...

І забыўшыся на гэты свет, які таксама часова забыўся пра яе і схаваўся, выказаўшы плачам сэрца свае смутку перад абіцеллю Міласці... і выканаўшы перад адыходам да сну, падобнаму да смерці, якая можа прыйсці ў любы момант, свой апошні абавязак, каб б завяршыць запіс сваіх дзённых учынкаў годным завяршэннем, устане ў кыям намазу, гэта значыць, замест усіх тленных яе любімых паўстане перад Адным Вечна Годным Пакланення (Мабуд-у Бакі) і Вечна Любімым (Махбуба-у Бакі) і замест усіх бяссільных стварэнняў, перад якімі яна прыніжаецца, прыйдзе да Аднаго Шчодрага і Усемагутнага (Кадыр-і Карым) і, каб выратавацца ад зла ўсяго шкоднаснага, што пры-

мушае яе дрыжаць, узыдзе да Аднаго Міласэрнага Захавальніка (Хафіз-і Рахім)... і пачне з суры «Фаціха», гэта значыць замест нікчэмнага і недарэчнага ўсхвалення недасканалых, жабрацкіх стварэнняў, праславіць славаю Аднаго Абсалютна Дасканалага (Каміль-і Мутлак), Абсалютна Багатага (Ганій-і Мутлак), Шчодрага (Карым) і Міласэрнага (Рахім) Госпада Сусветаў (Рабб-уль Алямін)... і ўзвысіцца да звароту: إِيَّاكَ نَعْبُدُ *«Табе мы пакланяемся»*, – гэта значыць не зважаючы на сваю драбніцу, мізэрнасць і адзіноту, дзякуючы сувязі з Царом Дня Суда (Малік-і Яумеддзін), Кіраўнікам Адвечнага і Вечнага (Азаль Абад Султан), узышоўшы на ступень распешчанага госця, які нясе важны абавязак у гэтым сусвеце, сказаўшы:

إِيَّاكَ نَعْبُدُ وَ إِيَّاكَ نَسْتَعِينُ *«Табе мы пакланяемся і Цябе просім дапамагчы»*, – ад імя ўсіх стварэнняў прадставіць Яму глыбокай пашаны і просьбы вялікай абшчыны і грандыёзнага сходу Сусвету... і, сказаўшы:

اِهْدِنَا الصِّرَاطَ الْمُسْتَقِيمَ *«Вядзі нас па дарозе прамой»* (Каран, 1:6), – папросіць весці яе

прама па «Сырат-і Мустакым», які з'яўляецца светлым шляхам, які сярод змроку будучага вядзе да Вечнага Шчасця... і разважаючы пра веліч Усявышняга Творцы (Зульджаляль), волі Якога, нібы паслухмяныя салдаты, падпарадкаваны сонца і прамяністыя зоркі, якія з'яўляюцца ў Яго гасцініцы свету лямпамі і слугамі, якія схаваліся цяпер нібы расліны і жывёлы, што паснулі, прамовіўшы: «Аллаху Акбар!» – схіліцца ў паясным паклоне... і, думаючы пра вялікі зямны паклон усяго стварэння, пра тое, як падобна да стварэнняў, што паснулі гэтай ноччу, кожны год і кожны стагоддзе ўсё жывое, нават уся Зямля і нават увесь сусвет, падобна дысцыплінаванай арміі, а хутчэй, нібы асобныя паслухмяныя салдаты падчас іх дэмабілізацыі па загадзе: كُنْ فَيَكُونُ *««Будзь!» - і яно бывае»* – гэта значыць, выпраўляючыся ў Патаенны Свет, са словамі «Аллаху Акбар» з поўнай дысцыплінай здзяйсняюць зямны паклон на сваім смяротным ложку... і наступнай вясной, з клічам ажыўлення і абуджэння, якое зыходзіць ад загаду: كُنْ فَيَكُونُ *««Будзь!» – і яно*

*бывае»*, – уваскросшы зноў часткова ў ранейшым выглядзе, часткова ў падобным, яны ціхмяна і пакорліва паўстаюць для служэння свайму Госпаду. Так і гэты маленькі чалавек, прытрымліваючыся іх прыкладу, апынуўшыся перад абіцеллю Таго Міласцівага Уладальніка Дасканаласці (Рахман-і Зулькамаль), Таго Міласэрнага Уладальніка Прыгажосці (Рахім-і Зульджамаль) з захопленай любоўю, у пакоры, якая вядзе да вечнасці, і ў ганаровым самапрыніжэнні, сказаўшы «Аллаху Акбар», зробіць зямны паклон. Гэта значыць – здзейсніць начны намаз, які з'яўляецца свайго кшталту ўзнясеннем – Мірадж. І ты, несумненна, зразумееў, наколькі гэта з'яўляецца добрым і выдатным, святым і ўзвышаным, мэтазгодным і годным абавязкам, служэннем і глыбокай пашанай Госпаду, і наколькі сур'ёзнай ісцінай...

Такім чынам, у сувязі з тым, што кожнае з гэтых пяці часоў з'яўляецца прадвесцем вялікіх ператварэнняў і пераўтварэнняў, прыкметай грандыёзных Божых дзеянняў і знакам усеагульнай міласці Усявышняга, прызначэнне выконваць гэты абавязак у на-

званыя часы, падобна выплаце сур'ёзнай пазыкі, з'яўляецца бясконцай мудрасцю...

سُبْحَانَكَ لَا عِلْمَ لَنَا اِلَّا مَا عَلَّمْتَنَا اِنَّكَ اَنْتَ الْعَلِيمُ الْحَكِيمُ

اَللّٰهُمَّ صَلِّ وَ سَلِّمْ عَلٰى مَنْ اَرْسَلْتَهُ مُعَلِّمًا لِعِبَادِكَ لِيُعَلِّمَهُمْ كَيْفِيَّةَ مَعْرِفَتِكَ وَ الْعُبُودِيَّةَ لَكَ وَ مُعَرِّفًا لِكُنُوزِ اَسْمَائِكَ وَ تَرْجُمَانًا لِاٰيَاتِ كِتَابِ كَائِنَاتِكَ وَ مِرْآتًا بِعُبُودِيَّتِهِ لِجَمَالِ رُبُوبِيَّتِكَ وَ عَلٰى اٰلِهِ وَ صَحْبِهِ اَجْمَعِينَ وَ ارْحَمْنَا وَ ارْحَمِ الْمُؤْمِنِينَ وَ الْمُؤْمِنَاتِ اٰمِينَ بِرَحْمَتِكَ يَا اَرْحَمَ الرَّاحِمِينَ

*«Прачысты Ты! Мы ведаем толькі тое, чаму Ты нас навучыў. Сапраўды, Ты – Дасведчаны, Мудры!»* (Каран, 2:32).

* * *

# Дваццаць першае Слова

## У двух тэмах

### Тэма першая

بِسْمِ اللّٰهِ الرَّحْمٰنِ الرَّحِيمِ
اِنَّ الصَّلٰوةَ كَانَتْ عَلَى الْمُؤْمِنِينَ كِتَابًا مَوْقُوتًا

«*У імя Аллаха, Міласцівага і Міласэрнага. Сапраўды, намаз прадпісаны вернікам у акрэслены час*» (Каран, 4:103).

Аднойчы адзін састарэлы мажны і высокапастаўлены чалавек сказаў мне: «Намаз добры, аднак з дня ў дзень здзяйсняць яго па пяць разоў абцяжарвае. Надакучвае з-за сваёй бясконцасці...».

Пасля таго прайшло нямала часу, я прыслухаўся да свайго нафсу і пачуў, што ён кажа тыя ж словы. Я звярнуў увагу, што ён сваім вухам ляноты бярэ ад сатаны тыя ж урокі. Тады я зразумеў: той чалавек сказаў гэта быццам ад імя ўсіх пачуццяў нафс-і аммара ці ж быў прымушаны імі прызнацца. Тады я

таксама сказаў: «Мае жарсці камандуюць, той, хто не ўтаймоўвае іх, не выхоўвае, не выпраўляе самога сябе, не можа выпраўляць іншых. Значыць, я пачну з сябе».

Я сказаў: «О, нафс!.. У адказ на гэтыя словы, сказаныя табой у поўным невуцтве, на хвалі гультайства, у сне бесклапотнасці, пачуй ад мяне гэтыя Пяць абуджэнняў».

**АБУДЖЭННЕ ПЕРШАЕ.** О, мая няшчасная душа (нафс)! Няўжо тваё жыццё ў гэтым свеце бясконцае? Хіба ёсць у цябе цвёрдая дамова, што ты дажывеш да наступнага года ці нават да заўтра? Тое, што надакучвае табе і наганяе нуду – гэта тваё ўяўленне пра вечнасць гэтага жыцця. Цырымонішся з-за ўцехаў і капрызаў, быццам вечна застанешся на гэтым свеце. Каб ты зразумела, што жыццё тваё кароткае і да таго ж праходзіць марна... Несумненна, аддаваць яе адну дваццаць чацвёртую частку добраму і прыемнаму, лёгкаму і дабрадатнаму служэнню, якое стане сродкам для дасягнення шчасця ў сапраўдным, вечным жыцці, не толькі не будзе надакучваць, але і стане нагодай для абуджэння вялікага жадання здзяйсняць намаз і асалоды пры яго здзяйсненні.

**АБУДЖЭННЕ ДРУГОЕ.** О, мой нафс, схільны да абжорства! Цікава было б ведаць: дзень пры дні ты ясі хлеб, п'еш ваду, удыхаеш паветра – хіба яны надакучваюць табе? Не надакучваюць, таму што праз аднаўленне патрэб ты не толькі не здавольваешся імі, але і, наадварот, адчуваеш задавальненне. Гэтак і намаз, які прыцягвае і ўбірае пажытак майго сэрца, жывую ваду маёй душы і лёгкае, прыемнае паветра найтанчэйшых божых пачуццяў, якія з'яўляюцца тваімі суседзямі ў будынку майго цела, не павінен здавольваць цябе.

Так, энергія і пажытак сэрца, якое церпіць ад незлічоных засмучэнняў, журбы і духоўнага болю, гарыць жарсцю да незлічоных уцехаў і памкненняў, могуць быць здабытыя стукам малітвы ў дзверы аднаго Усемагутнага Міласэрнага і Шчодрага (Рахім-і Карым).

Так, душа, што мае сувязь са шматлікімі стварэннямі і пакутуе ад іх нястрымна хуткага сыходу з гэтага тленнага свету з крыкамі разлукі, можа піць жывую ваду, звяртаючыся намазам да крыніцы ласкі аднаго Вечнага Госпада (Мабуд-у Бакі), аднаго Бясконцага Любага (Махбуб-у Сармадзі), Яко-

га дастаткова наўзамен усяго для гэтай душы.

Так, надзеленая свядомасцю чалавечая таемнасць, умелае Божае прамяністае стварэнне, якое па прыродзе сваёй жадае вечнасці і створанае для яе, якое з'яўляецца люстэркам аднаго Спрадвечнага і Вечнага, якое ў крайняй ступені крохкае і далікатнае, знаходзячыся ў абставінах гэтага свету, – неспакойных, цяжкіх і давячых, недаўгавечных, змрочных і трывожных – канечне, у крайняй ступені мае патрэбу ў перадышцы. І яно зможа перадыхнуць толькі з дапамогай намазу.

**АБУДЖЭННЕ ТРЭЦЯЕ.** О мой нецярплівы нафс! Няўжо будзе разумна, калі ты, раздумваючы сёння пра мінулыя цяжар і клопаты пакланення і намазу, а таксама пра цяжар бядот мінулых дзён, станеш пакутаваць і перажываць; а таксама, уяўляючы сёння будучыя абавязкі, доўг пакланення і намазу і горыч бядот наступных дзён, станеш праяўляць нецярпенне? У такім нецярпенні ты будзеш падобным да рассеянага камандзіра, які, нягледзячы на тое, што сілы правага фланга праціўніка, далучыўшыся да

яго правага боку, сталі для яго падмацаваннем, возьме і накіруе свае важныя сілы да правага фланга, аслабіўшы пры гэтым цэнтр. І апроч таго, у той час як на левым флангу няма войск праціўніка і яны яшчэ не з'явіліся, накіруе туды значныя сілы і загадае: «Адкрыць агонь!» – і свой цэнтр зусім пакіне без сіл. Праціўнік жа зразумее, у чым справа, атакуе цэнтр і разграміць яго. Так, ты падобны да гэтага камандзіра. Справа ў тым, што клопаты і цяжар мінулых дзён сёння абярнуліся ў ласку. Іх горыч сышла, засталася асалода. Цяжар прымкнуў да ўмельства, а клопаты і складанасці абярнуліся ўзнагародай. Значыць, трэба не стамляцца ад намазу, а наадварот, неабходна знайсці новы стымул, атрымаць жыватворнае задавальненне, сур'ёзна натхніцца для працягу. Думаць жа сёння пра наступныя дні, адчуваць нуду і губляць руплівасць, пакуль яны яшчэ не насталі – гэта акурат такое ж глупства, як маліць, рыдаць і галасіць, непакоячыся сёння аб будучых голадзе і смазе. Паколькі ісціна такая, то, калі ты разважлівы, у дачыненні да пакланення і намазу думай толькі пра сёння і гавары так: «Сёння адну гадзіну я аддаю прыемнаму, добраму і святому служэнню,

узнагарода за якое дужа вялікая, а цяжар яго вельмі нязначны». Тады твая нудлівая апатыя ператворыцца ў прыемную старанасць.

Дык вось, о, мой нецярплівы нафс! Ты адказны за тры цярплівасці. Першая – цярплівасць у пакорнасці Усявышняму. Другая – цярплівасць для неўчынення грахоў. Трэцяя – цярплівасць пры няшчасці. Калі ты разважлівы, дык вазьмі за правіла гэту ісціну з Трэцяга абуджэння і мужна скажы: «Йа Сабур!» (Дай Бог цярпення). Узвалі гэтыя тры цярплівасці на свае плечы. Калі ты не растраціш на няправільным шляху сілу цярпення, дадзеную табе Усявышнім, тады яна зможа быць табе дастатковай пры любых цяжкасцях і пры ўсялякай бядзе. Абапірайся на гэтую сілу – і ты вытрымаеш любыя цяжкасці з дапамогай яе...

**АБУДЖЭННЕ ЧАЦВЁРТАЕ.** О, мой рассеяны нафс! Няўжо гэты абавязак пакланення Богу безвыніковы? Хіба ўзнагарода за яго выкананне такая нязначная, што ён надакучвае табе, наганяе нуду? Між тым, калі які-небудзь чалавек дасць табе нейкую колькасць грошай ці ж напужае, ён прымусіць

цябе працаваць з раніцы да вечара. І ты без стомы будзеш працаваць. Хіба намаз, які ў гасцініцы гэтага свету з'яўляецца энергіяй і здаволенасцю для твайго слабога і беднага сэрца, а таксама пажыткам і святлом у тваёй магіле, якая, несумненна, стане тваім прывалам, і сведчаннем і паслужным лістом на Зборы Суднага Дня, які абавязкова стане тваім судом, і святлом і райскім канём на мосце Сырат, па якім, хочаш не хочаш, а прыйдзецца прайсці, з'яўляецца безвыніковым? Ці ж узнагарода за яго нязначная?

Калі які-небудзь чалавек паабяцае табе ўзнагароду ў сто лір, ён прымусіць цябе працаваць на яго сто дзён. Ён можа не стрымаць свайго слова, але ты даверышся гэтаму чалавеку і будзеш рупліва працаваць. Цікава, а калі Адзін, адносна Якога невыкананне абяцання з'яўляецца абсурдным, паабяцае табе такую ўзнагароду, як Рай, і такую плату, як вечнае шчасце, і на вельмі кароткі час займе цябе ў добрым служэнні, і калі ты не станеш служыць Яму ці ж сваім неахвотным, як нявольнік, ці з нудою, наспех служэннем будзеш ставіць Яго абяцанне Яму ў дакор і грэбаваць Яго ўзнагароджан-

нем, ці не думаеш ты, што будзеш заслугоўваць вельмі суровай кары і жахлівых пакутаў? У той час як на гэтым свеце ад страху турэмнага зняволення ты старанна працуеш на самых цяжкіх работах, няўжо страх перад вечным, пажыццёвым зняволеннем у такую турму, як Пекла, не дадае табе сілаў для самага лёгкага і прыемнага служэння – служэння Госпаду?

**АБУДЖЭННЕ ПЯТАЕ.** О, мой нафс, які любіць зямное жыццё! Цікава, ці ад мноства свецкіх спраў пахозіць твая вяласць і апатыя ў пакланенні і недахопы, якія маюцца ў тваім намазе? Ці ж ад таго, што ты не можаш знайсці часу з-за зямных клопатаў? Няўжо ж ты створаны толькі для зямнога жыцця, што ўвесь свой час аддаеш яму?

Ты ведаеш, што ў дачыненні да здольнасцяў і талентаў ты знаходзішся вышэй за ўвесь жывёльны свет, але ў дачыненні да сіл і магчымасцяў набыць усё неабходнае табе ў зямным жыцці ты не зможаш дасягнуць і ўзроўню якога-небудзь вераб'я. Як жа ты не разумееш, што асноўнае тваё прызначэнне заключаецца не ў тым, каб насіцца, як жывёла, а, несумненна, у тым, каб працаваць як

сапраўдны чалавек для сапраўднага, вечнага жыцця. А тое, што ты называеш свецкімі справамі і клопатамі, – гэта часцяком пустыя заняткі, якія не датычацца цябе і ў якія ты празмерна ўмешваешся, у якіх залішне корпаешся. Кінуўшы самыя неабходныя і неадкладныя справы, быццам маеш наперадзе тысячы гадоў жыцця, марнуеш час на самыя непатрэбныя, пустыя рэчы. Напрыклад, на атрыманне такіх нікчэмных, бескарысных звестак кшталту «А як размяшчаюцца кольцы вакол Сатурна?» ці «Якія амерыканскія куры?», бескарысна праводзіш свой каштоўны час. Быццам ад ведання касмаграфіі ці статыстыкі ты атрымліваеш нешта каштоўнае!..

Калі скажаш: «Тое, што перашкаджае здзяйсняць намаз і служыць Госпаду, а таксама наганяе нуду – гэта не такога кшталту непатрэбныя, пустыя рэчы, а вымушаныя клопаты пра жыццё, пра сродкі існавання», тады я адкажу табе: «Калі ты будзеш працаваць з дзённым заробкам у сто грошай, а потым нехта прыйдзе і скажа табе: «Давай, пакапай тут каля дзесяці хвілін, знойдзеш брыльянт і ізумруд вартасцю ў сто лір»; і

калі ты адкажаш яму: «Не, не пайду, таму што мой дзённы заробак зменшыцца на дзесяць грошай, скарацяцца мае сродкі да існавання», – то, канечне, зразумееш, наколькі гэта глупая адгаворка».

І падобна да гэтага ты працуеш у сваім садзе, каб зарабіць сабе на хлеб. Калі ты кінеш, не будзеш здзяйсняць абавязковы фарз-намаз, капітал усіх тваіх клопатаў абмяжуецца толькі зямнымі, нязначнымі і бясплоднымі сродкамі існавання ў гэтым свеце. А калі ж ты выкарыстаеш свой час перадышкі на намаз, які з'яўляецца сродкам для супакаення душы, для адпачынку сэрца, тады, апроч добрага свецкага заробку, ты знойдзеш яшчэ і дзве своеасаблівыя крыніцы, якія стануць важным вытокам тваіх сродкаў да жыцця на тым свеце і пажытку свету іншага.

**Першая крыніца**: ад усхваленняў (Тварца) кожнай раслінай, у тым ліку кожным дрэвам, ці пладовым, ці кветкавым, якія ты вырошчваеш у сваім садзе, ты атрымліваеш узнагароду з дапамогай добрага намеру.

**Другая крыніца**: і акрамя таго, хто б ні еў плады з гэтага саду – будзе гэта чалавек ці

жывёла, карова ці муха, пакупнік ці злодзей – гэта запішацца табе ў якасці міласціны-садака. Аднак з той умовай, што ты будзеш распараджацца садам у імя Сапраўднага Карміцеля (Раззак-і Хакікі) і ў межах дазволенага Ім, а сябе будзеш разглядаць у якасці служачага, які размяркоўвае Яго багацці паміж Яго стварэннямі...

Дык вось, звярні ўвагу, якую вялікую страту пацерпіць той, хто не будзе здзяйсняць намаз. Якое вялікае багацце ён страціць, застаўшыся без тых вынікаў, тых дзвюх крыніц, што значна натхняюць на працу і забяспечваюць маральны дух у рабоце. Калі ён пастарэе, яму надакучыць садоўніцтва, ён стоміцца ад яго. «Навошта мне гэта? – скажа ён. – Я і так сыходжу з гэтага свету. Нашто я буду так турбаваць сябе?» – і яго агарне лянота. Аднак жа першы чалавек скажа: «Апроч яшчэ большага служэння Госпаду, пакланення Яму, я буду імкнуцца да працы, дазволенай Божымі законамі (халяль), каб адправіць у сваю магілу яшчэ больш святла і падрыхтаваць для свайго жыцця на тым свеце яшчэ больш правізіі».

**Выснова**. О, нафс! Ведай: учорашні дзень

выслізнуў з тваіх рук. А заўтрашні дзень – у тваіх руках няма ж дагавору, што ты валодаеш ім. Такім чынам, сваё рэальнае жыццё ведай у тым дні, у якім жывеш. І хаця б адну гадзіну дня, як рэзервовы фонд, як зберажэнні на будучыню, аддавай якой-небудзь мячэці ці малітоўнаму дыванку, што з'яўляюцца скарбонкай іншага, замагільнага свету, зробленай дзеля сапраўднай будучыні.

І да таго ж ведай: кожны новы дзень з'яўляецца для цябе і для кожнага дзвярыма новага свету. Калі ты не будзеш здзяйсняць намаз, тады твой свет у той дзень будзе змрочным і хаатычным, а ў Свеце Місаль будзе сведчыць супраць цябе. Бо ў любога чалавека штодзённа ў гэтым свеце маецца адзін асаблівы, уласцівы толькі яму свет. І стан гэтага асабістага свету залежыць ад сэрца і ўчынкаў гэтага чалавека.

Падобна да таго, як які-небудзь раскошны палац, што тыназіраеш у люстэрку, будзе залежыць ад колеру гэтага люстэрка: калі яго колер будзе чорным, то палац здасца чорным, калі чырвоным – то здасца чырвоным. І, акрамя таго, будзе залежыць ад якасці люстэрка: калі паверхня гэтага люстэрка

будзе роўнай і бездакорнай, тады яно пакажа палац прыгожым; калі ж яго паверхня няроўная – пакажа брыдкім. Падобна да таго, як яно крыва паказвае самыя дасканалыя рэчы, так і ты сваім сэрцам, розумам, учынкамі і душой зменіш вобраз свайго свету. Ты зможаш прымусіць сведчыць яго ці на сваю карысць, ці ж супраць сябе.

Калі ты будзеш здзяйсняць намаз, калі гэтым намазам звернешся да Велічнага Творцы (Сані Зульджаляль) гэтага свету, тады твой свет, які залежыць ад цябе, імгненна асвяціцца, быццам твой намаз – гэта электрычная лямпачка, і твой намер здзейсніць яго, падобна да націскання кнопкі ўключальніка, разгоніць цемру гэтага свету. Асвеціць і пакажа, што розныя змены і працэсы, якія адбываюцца ў блытаніне ў мітусні гэтага свету, з'яўляюцца мудрай гармоніяй і шматзначным пісьмом Магутнасці. І асвеціць тваё сэрца адным промнем ад гэтага прамяністага аята Карану:

اَللّٰهُ نُورُ السَّمٰوَاتِ وَالْاَرْضِ «*...Аллах – святло нябёсаў і зямлі...*» (Каран, 24:35). І водбліскам гэтага святла азарыць твой свет таго дня, і

ззяннем прымусіць сведчыць яго на тваю карысць.

Глядзі, не гавары так: «На якім узроўні мой намаз, і на якім гэта ісціна, гэта сутнасць намазу!» Бо адна костачка фініка апіша сваё дрэва так жа, як фінікавая пальма. І падобна да таго як розніца тут заключаецца толькі ў змесце і ў падрабязнасцях, так і намаз якога-небудзь простага чалавека, накшталт твайго ці майго, нават калі гэта не адчуецца, падобны да намазу якога-небудзь вялікага святога, бо ёсць прамень ад гэтага святла, утоеная ісціна ад гэтай сутнасці. Аднак развіццё і асвятленне, у залежнасці ад ўзроўняў, вельмі адрозныя. Падобна да таго як маецца шмат стадый у развіцці якой-небудзь фінікавай пальмы, пачынаючы ад яе костачкі і заканчваючы самой пальмай са спелымі пладамі, так і ва ўзроўнях намазу іх можа існаваць яшчэ больш. Але ва ўсіх гэтых стадыях маецца сутнасць той светлай ісціны...

اَللّٰهُمَّ صَلِّ وَسَلِّمْ عَلٰى مَنْ قَالَ: اَلصَّلٰوةُ عِمَادُ الدِّينِ وَعَلٰى اٰلِهِ وَصَحْبِهِ اَجْمَعِينَ

*«О, Аллах! Дабраславі і вітай з мірам Паважнага Пасланца, які сказаў: «Намаз – апора рэлігіі», усю яго сям'ю і паплечнікаў».*

* * *

# Пасляслоўе

[Удар па бестурботнай галаве і адзін урок-настаўленне]

بِسْمِ اللّٰهِ الرَّحْمٰنِ الرَّحِيمِ

وَمَا الْحَيٰوةُ الدُّنْيَآ اِلاَّ مَتَاعُ الْغُرُورِ

*«У імя Аллаха Міласцівага, Міласэрнага... А бліжэйшае жыццё – толькі асалода спакусамі»* (Каран, 3:185).

О, мой няшчасны нафс, які пагрузіўся ў бестурботнасць, знайшоў гэтае жыццё салодкім, забыўся пра Вечнае жыццё і прагне гэтага свету! Ці ведаеш, на што ты падобны? Ты падобны да страуса: ён бачыць паляўнічага, але паляцець не можа, хавае сваю галаву ў пясок, каб паляўнічы не бачыў яго! Але яго вялікае цела – на паверхні. паляўнічы бачыць страўса, аднак той зачыніў свае вочы ў пяску і не бачыць паляўнічага. О, нафс! Звярні ўвагу на гэта прыпадабненне, зразумей, як зварот толькі да гэтага свеце ператварае святое асалода ў горкае пакута.

Напрыклад, у гэтым паселішчы (гэта значыць у Барле) ёсць два чалавекі. Дзевяноста дзевяць са ста сяброў аднаго з іх перасяліліся ў Стамбул і выдатна там жывуць. Толькі ён адзін застаўся тут, але таксама хутка пераедзе туды. А таму гэты чалавек горача жадае з'ехаць у Стамбул, думае пра яго і жадае жыць там і сустрэцца з сябрамі. Калі яму скажуць: «Перасяляйся туды!» – ён з радасцю пераедзе.

І ёсць другі чалавек – дзевяноста дзевяць са ста яго сяброў пайшлі адгэтуль. Некаторая частка з іх загінула, а іншая – прапала без вестак. Ён мяркуе, што яны зніклі назаўжды. І гэты няшчасны хоча знайсці суцяшэнне, прывязаўшыся замест усіх іх толькі да аднаго чалавека, які таксама хутка адыдзе. З дапамогай гэтага ён хоча забыць пра горкі боль расстанняў.

О, нафс! Спачатку Улюбёнец Аллаха – Прарок Мухаммад (мір яму і дабраславенне Усявышняга), а потым усё твае блізкія і сябры – па той бок магілы. Тыя, адзін-два, што засталіся тут з іх таксама сыйдуць. Не вельмі адварочвайся, палохаючыся смерці, баючыся магілы! Смела глядзі на магілу, паслу-

хай, што яна патрабуе! Смейся ў вочы смерці, паглядзі, чаго яна хоча! Але глядзі, не будзь падобны да другога чалавека, які стаў бестурботным! О, мой нафс! Не кажы: «Час змяніўся, стагоддзе стала іншым, усе заглыбіліся ў гэты свет, ставяць вышэй за ўсё зямное жыццё, п'янкім клопатам пра яго». Справа ў тым, што смерць не мяняецца. Расстанне, застаючыся расстаннем, не пераходзіць у вечнасць. Чалавечая бездапаможнасць і беднасць не мяняюцца, але множацца. І рух чалавека па шляху жыцця да магілы не спыняецца, а развівае хуткасць.

Не кажы: «Я такі ж, як усе», таму што кожны чалавек будзе табе спадарожнікам толькі да магілы. А такое суцяшэнне, як «быць у бядзе разам з усімі», па той бок магілы (г.зн. пасля смерці) цалкам беспадстаўна.

Да таго ж, не думай, што ты прадстаўлены самому сабе! Бо, калі ты агледзішся навокал у гэтай гасцініцы сусвету мудрым позіркам, то не зможаш убачыць нічога бязладнага або бессэнсоўнага. А як жа ты зможаш застацца без суладдзя, без мэты? І гэтыя з'явы, якія адбываюцца ў сусвеце,

накшталт землятрусаў, не з'яўляюцца выпадковасцю. Нягледзячы на тое, што ты бачыш апранутыя (Творцам) на зямлю адно на іншае вельмі акуратныя і размаляваныя сукенкі з розных раслін і жывёл, якія ад пачатку і да канца ўпрыгожаны сэнсам і мудрасцю, а таксама ведаеш, што дзеля ўзнёслых мэтаў Зямля круціцца і абарочваецца (Госпадам) з дасканалым парадкам, накшталт натхнёна танцуючага дэрвіша Меўлеві, то як можна такія смяротныя з'явы, як землятрусы, якія адбываюцца ў жыцці Зямлі, уявіць бязглуздымі і стыхійнымі, паказаць пустымі і марнымі горкія страты ўсіх пацярпелых бедства, што прывядзе іх у адчай. Пры гэтым здзяйсняецца і вялікая памылка, і вялікая несправядлівасць.

Несумненна, такога кшталту падзеі з'яўляюцца, па загадзе аднаго Мудрага і Міласэрнага (Хакім-і Рахім), увекавечаннем тленнай маёмасці вернікаў людзей шляхам ператварэння яго ў міласціну, а таксама выкупленнем грахоў, якія зыходзяць ад няўдзячнасці да Усявышняга.

Гэтаксама надыдзе і такі дзень, калі гэтая пакорлівая Богу Зямля ўбачыць стварэнні

чалавека, якія ўпрыгожваюць яе аблічча, але супярэчаць адзінабожжу і выкарыстоўваюцца без падзякі, з-за чаго знойдзе іх пачварнымі і па загадзе свайго Стваральніка грандыёзным землятрусам сатрэ іх са свайго аблічча, ачысціць яго і па загадзе Госпада адправіць язычнікаў у Пекла, а ўдзячным скажа: «Сардэчна запрашаем у Рай».

* * *

## З кнігі «Ішарат-уль Іджаз»

يَآ اَيُّهَا النَّاسُ اعْبُدُوا رَبَّكُمُ الَّذٖى خَلَقَكُمْ وَ
الَّذٖينَ مِنْ قَبْلِكُمْ لَعَلَّكُمْ تَتَّقُونَ ۝
اَلَّذٖى جَعَلَ لَكُمُ الْاَرْضَ فِرَاشًا وَالسَّمَآءَ بِنَآءً
وَاَنْزَلَ مِنَ السَّمَآءِ مَآءً
فَاَخْرَجَ بِهٖ مِنَ الثَّمَرَاتِ رِزْقًا لَكُمْ فَلَا
تَجْعَلُوا لِلّٰهِ اَنْدَادًا وَ اَنْتُمْ تَعْلَمُونَ

*«О, людзі! Пакланяйцеся вашаму Госпаду, які стварыў вас і ўсіх, хто быў да вас – так вы дасягнеце набожнасці. І зноў жа, пакланяйцеся вашаму Госпаду, які стварыў вам зямлю дыванам, а нябёсы – дахам вашага дому, і звёў з неба ваду, каб выгадаваць плён і іншую ежу для вашага існавання. Так не ўзвялічвайце нікога акрамя Аллаха – вы ж ведаеце: іншага Бога і Творцы, акрамя Яго – няма»* (Каран, 2:21-22).

# Уступ

(з кнігі «Указанні цудоўнага красамоўства»)

Толькі дзякуючы пакланенню Усявышняму (г.зн. намаз, пост і г.д.) умацоўваюцца і ўсталёўваюцца прадпісанні акыды (верапераканнні) і імана, яны становяцца ўменнем. Так, калі прадпісанні імана, заснаваныя на сумленні і розуме, не будуць выхоўвацца і ўмацоўвацца пры дапамозе пакланення, якое заключаецца ў выкананні наказаў Аллаха і ўстрыманні ад таго, што забаронена Ім, то іх уздзеянне і вынік застануцца слабымі. Цяперашняе становішча Ісламскага свету гэта пацвярджае. І гэтак жа, як пакланенне з'яўляецца сродкам для дасягнення шчасця як на гэтым, так і на тым свеце, такім жа чынам яно служыць для ўпарадкавання зямных спраў чалавека і яго ўчынкаў, якія датычацца жыцця на тым свеце, выступае сродкам для асабістага і агульначалавечага ўдасканалення, а таксама вельмі ўзвышаннай і пачэснай сувяззю паміж Творцам і Яго рабом.

Вось акалічнасці, якія тлумачаць, чаму пакланенне з'яўляецца сродкам для дасягнення шчасця ў гэтым свеце.

**Першая:** чалавек ад стварэння мае перавагу перад жывёльным светам і знаходзіцца на асаблівым становішчы, з дзівоснай і тонкай натурай. І вось з-за яе ў чалавека і ўзніклі разнастайныя схільнасці і жаданні. Напрыклад, чалавек жадае ўсё толькі выбранае, аддае перавагу самаму лепшаму, хоча мець раскошныя рэчы, імкнецца жыць з пашанай, вартым чалавека жыццём.

Паколькі ён з прычыны дадзеных схільнасцяў імкнецца задаволіць свае патрэбы ў ежы, вопратцы і да т.п., такім жа чынам, каб свабодна набыць іх, чалавеку патрэбныя і шмат якія рамёствы. Але з-за таго, што ён не дасведчаны ва ўсіх рамёствах, ён вымушаны супрацоўнічаць з сабе падобнымі, каб кожны з іх шляхам абмену вынікамі сваёй працы дапамагаў свайму кампаньёну, і дзякуючы гэтаму яны змаглі б задаволіць свае патрэбы.

Аднак з прычыны таго, што плоцевыя пачуцці, разумовыя здольнасці і сіла гневу чалавека не абмежаваныя з боку Тварца, і

з-за таго, што ім дадзеная свабода, каб з дапамогай невялікай чалавечай волі даць яму магчымасць удасканальвацца, ва ўзаемаадносінах паміж людзьмі ўзнікаюць несправядлівасць і прэтэнзіі адзін да аднаго. Каб прадухіліць іх узнікненне, чалавечаму грамадству патрэбна правасуддзе пры абмене вынікамі працы. Але з прычыны таго, што розум усякай асобы бяссільны пазнаць, дзе справядлівасць, неабходны ўсеагульны розум, каб людзі скарыстоўвалі яго пры стасунках адзін з адным. А такі розум існуе толькі ў выглядзе закону, і такім законам з'яўляецца Шарыят (Божыя законы).

Затым неабходныя крыніца і адказны правадыр, які забяспечыць дзеянне Шарыята і яго ажыццяўленне. А такой крыніцай і адказным правадыром з'яўляецца толькі Прарок. Падобна да таго, як і асобе, што з'яўляецца Прарокам, патрэбныя матэрыяльная і духоўная веліч і перавага для працягу свайго знешняга і ўнутранага вяршэнства над народам, такім жа чынам яму патрэбныя і доказы, каб паказаць сваю ступень сувязі з Тварцом. І такімі доказамі з'яўляюцца толькі цуды.

Затым існуе неабходнасць замацаваць у свядомасці людзей веліч Тварца, каб заснаваць і забяспечыць падпарадкаванне і пакорнасць загадам і забаронам Усявышняга. Гэта замацаванне магчыма толькі з дапамогай акыды (вераперакананні), г. зн. раскрыццём прадпісанняў іману. А ўмацаванне і развіццё прадпісанняў імана магчыма толькі з дапамогай пакланення, якое, паўтараючыся, безупынна аднаўляецца.

**Другая**: пакланенне неабходна, каб накіраваць думкі чалавека да Мудрага Тварца (Сані Хакім). Зварот да Мудрага Тварца (Сані Хакім) чалавека, які пакланяецца Яму, выкліча паслушэнства і пакорнасць Госпаду. А паслушэнства ж і пакорнасць Госпаду прывучаць чалавека, які пакланяецца, да парадку. З прыходам гэтага чалавека да дысцыпліны і з падпарадкаваннем парадку ажыццявіцца таямніца мудрасці. А мудрасць раскрыецца з дапамогай майстэрскіх аздабленняў, што ззяюць на старонках сусвету.

**Трэцяя**: чалавек з'яўляецца цэнтрам упарадкаванасці ўсіх стварэнняў і законаў сусвету, а таксама промняў божых законаў, што пануюць у сусвеце. На гэтай падставе

неабходна сувязь чалавека з гэтымі законамі і яго трывалая адданасць ім, каб ён ухапіўся за падол гэтых законаў, дзякуючы гэтаму спрыяў бы ўсеагульнаму цячэнню ў сусвеце і, дзейнічаючы супраць ходу механізмаў, што функцыянуюць у розных слаях гэтага свету, не быў бы расціснуты пад іх коламі. А гэта магчыма толькі дзякуючы пакланенню Усявышняму, якое заключаецца ў выкананні Яго запаведзяў і неўчыненні забароненага Ім.

**Чацвёртая:** дзякуючы падпарадкаванню законам і ўстрыманню ад учынення забароненага ў чалавека з'яўляецца повязь з многімі коламі грамадскага жыцця.

Асабліва ў адносінах рэлігійных прадпісанняў і грамадскіх спраў адна асоба зойме становішча змястоўнай асобы, г.зн. на яе будзе ўскладзена такое мноства абавязкаў, як правы адносна становішча, шмат добрых якасцяў, настаўленняў, ведаў, норм. Калі не будзе такой асобы, якая кіруецца гэтымі законамі і ўстрымліваецца ад здзяйснення забароненага, то тыя абавязкі будуць цалкам растаптаныя.

**Пятая**: чалавек, дзякуючы Ісламу і пакла-

ненню, набывае моцную сувязь з усімі мусульманамі і прывязваецца да іх, а гэта ўсё будзе асновай для непарушнага братэрства і сапраўднай любові. Дарэчы, пачатковымі прыступкамі да ўдасканалення і прагрэсу грамадства з'яўляюцца братэрства і любоў паміж людзьмі.

Растлумачэнне таго, чаму пакланенне з'яўляецца сродкам для асабістага ўдасканалення. Хаця фізічна чалавек і з'яўляецца маленькім, слабым і бездапаможным і разглядаецца як частка жывёльнага свету, ён нясе ў сабе вельмі высокі дух і валодае дужа вялікімі талентамі, ён валодае шмат якімі схільнасцямі і незлічонымі імкненнямі, у яго маецца незлічонае мноства думак і такія неабмежаваныя пачуцці, як жарсць і гнеў, і ён валодае такой дзівоснай натурай, быццам ён створаны ў якасці каталога ўсіх відаў і сусветаў.

Такім чынам, пакланенне Усявышняму ўзвышае душу такога чалавека, дае развіцца яго талентам, дае выправіцца і ачысціцца яго схільнасцям, ажыццявіцца яго памкненням, пашырае яго меркаванні і парадкуе думкі, абмяжоўвае сілы жарсці і гневу,

счышчае «іржу» натуры, што забруджвае яго знешнія і ўнутраныя органы і пачуцці, дае вырасці чалавеку да прызначанай яму дасканаласці, і толькі пакланенне з'яўляецца самай узвышанай і найтанчэйшай сувяззю паміж рабом, які пакланяецца, і Усявышнім (Мабуд).

Гэтыя сувязь і адносіны – самая высокая дасканаласць чалавека.

**Напамін**: душой пакланення з'яўляецца шчырасць (іхлас). А шчырасць – гэта пакланенне толькі таму, што гэта загадваецца Госпадам. Калі прычынай пакланення будзе якая-небудзь іншая мудрасць ці карысць, то гэта пакланенне з'яўляецца пустым, бессэнсоўным. Іншыя карысць і мудрасць пакланення могуць быць толькі стымулам, але не асноўнай яго прычынай.

* * *

## Водгук на кнігі «Рысале-і Нур». Што такое «Рысале-і Нур»? Якая сутнасць «Рысале-і Нур» і яго аўтара адносна шляхоў пошуку ісціны?

Вялікія служыцелі Іслама, з'яўленне якіх у пачатку кожнага стагоддзя прадказана хадзісам, у справах рэлігіі не з'яўляюцца пачынальнікамі, адкрывальнікамі новага, яны з'яўляюцца паслядоўнікамі.

Гэта значыць, нешта новае, ад сябе, яны не вынаходзяць, не прыносяць новых наказаў.

Шляхам дакладнага прытрымлівання асноваў, наказаў рэлігіі і суны Мухаммада (мір яму і дабраславенне Аллаха) надаюць каштоўнасцям Іслама адпаведную ступень і ўмацоўваюць іх, выяўляюць сапраўдны вобраз рэлігіі, прыбіраюць неадпаведнасці, якія стараліся прымешваць да рэлігіі, адбіваюць і прадухіляюць нападкі на рэлігію, адраджаюць у думках і сэрцах людзей Божыя наказы, абвяшчаюць і тлумачаць святасць і веліч Божых законаў. Не разбураючы асновы, не скажаючы сапраўдны дух рэлігіі, толькі выконваюць свой абавязак, ужываючы новыя спосабы растлумачэння, скарыстоўваючы

новыя падрабязнасці і паказальныя сэнсы, адпаведныя разуменню свайго часу.

Гэтыя людзі, якія служаць Госпаду, учынкамі і справамі таксама становяцца пацвярджэннем сваёй прызначанасці, уласнымі дзеяннямі паказваюць ступень і цвёрдасць сваёй веры і шчырасці. Яны з'яўляюцца абсалютным увасабленнем высокай маралі Мухаммада (мір яму і дабраславенне Аллаха), сапраўднымі носьбітамі яго вобраза і выдатных якасцяў.

**Выснова**. Адносна пакланення, учынкаў, нораву, прытрымлівання і адданасці суне Прарока (мір яму і дабраславенне Аллаха) яны становяцца дасканалым узорам для уммы (паслядоўнікаў) Мухаммада (мір яму і дабраславенне Аллаха) і прыкладам для пераймання. Іх тлумачэнні Карану, растлумачэнні законаў рэлігіі, настаўленні, адпаведныя ўзроўню ведаў і разуменню часу, не з'яўляюцца сачыненнем па жаданні іх нафсаў, вынікам велічы розумаў, праніклівасці і ведаў. Гэтыя творы – прамыя духоўныя натхненні і парады, якія ідуць ад крыніцы вахія, што з'яўляецца пасланнем прарока Мухаммада (мір яму і дабраславенне Аллаха).

«Джальджалюцыя» (Імам Алі (няхай будзе задаволены ім Аллах)), «Меснэві-і Шарыф» (Меўлана Джалаладдзін Румі (няхай будзе задаволены ім Аллах)), «Футух-аль Гайб» (Абдул-Кадзір Гейлані (няхай будзе задаволены ім Аллах)) з'яўляюцца такімі творамі. Гэтыя праслаўленыя асобы з'яўляюцца толькі выразнікамі святых твораў. Адзіная іх роля заключаецца ва ўпарадкаванні і метадзе выкладання; г. зн. гэтыя вялікія асобы ўганараваны тымі сэнсамі і адлюстроўваюць іх. Што датычыцца «Рысале-і Нур» і яго аўтара: у гэтым вядомым творы ёсць святое багацце, бязмежная дасканаласць і непараўнанае Божае праяўленне, не дасягнутае ў іншых творах.

Несумненна, ён атрымаў шчодрую спадчыну ад Свяшчэннага Карану, які з'яўляецца сонцам спасціжэння сапраўднай Веры і святлом шчасця. З-за таго што яго асновай з'яўляецца чыстае святло Карану, ён яшчэ болей валодае багаццем святла Мухаммада (мір яму і дабраславенне Аллаха), чым творы святых. Яго доля ад прарочай місіі Пасланца (мір яму і дабраславенне Аллаха), сувязь з ім і Яго (мір яму і дабраславенне

Аллаха) святы ўплыў большыя, чым у творах святых. Канечне, годнасць аўтара і яго дасканаласць адпаведна вялікія і непараўнаныя, што з'яўляецца відавочнай, як сонца, ісцінай. Гэты чалавек яшчэ ў дзяцінстве, не маючы ніякай адукацыі, атрымаўшы толькі пачатковыя веды цягам трохмесячнага навучання, стаў спадкаемцам ведаў мінулых і цяперашніх часоў, ладуніята, сутнасці рэчаў, сакрэтаў Сусвету і Божых мудрасцяў, чаго ніхто да гэтага дня не ўганараваўся.

Не было раней падабенства такім надзвычайным ведам. Няма ніякага сумнення ў тым, што тлумачальнік Святла з поўным увасабленнем добрапрыстойнасці, з дзіўнай адвагай, абсалютнай здаволенасцю, сфарміраваўшыся ў выключным стойкім нораве, з'яўляецца незвычайнай натурай, увасобленай ласкай і безумоўным Божым дарам. Гэта надзвычайная асоба яшчэ да паўналецця, як непераўзыдзены вучоны, кідаў выклік усяму навуковаму свету, у дыспутах пераконваў і прымушаў змоўкнуць знатакоў розных навук. Дзе б ён ні быў, дакладна, ні ў чым не вагаючыся, адказваў на любое пытанне. З чатырнаццаці гадоў насіў ганаровае званне

настаўніка. Заўсёды распаўсюджваў вакол сябе святло ведаў і мудрасці. Яго тонкія і глыбокія растлумачэнні ўражвалі вучоных веліччу і магутнасцю, пранікліваспю ў вырашэнні праблем і святлом мудрасці, то яму заслужана прысудзілі званне «Бадзіуззаман». Дзякуючы сваім высокім маральным асновам і вялікім ведам ён стаў дасканалым прыкладам у распаўсюджванні і доказе рэлігіі Мухаммада (мір яму і дабраславенне Аллаха).

Канечне ж, такі чалавек заслужыў вялікую прыхільнасць Найшаноўнейшага Правадыра Прарокаў (мір яму і дабраславенне Аллаха), Яго аховы і падтрымкі. І, несумненна, ён з'яўляецца велікадушнай асобай, якая дзейнічае пад заступніцтвам Вялікага Пасланца (мір яму і дабраславенне Аллаха) і па Яго наказу і закону, з'яўляецца спадкаемцам і адлюстравальнікам Яго святла і ісціны. Паказанае ім хараство ззяння Святла Прароцтва Мухаммада (мір яму і дабраславенне Аллаха), яго веды, багацце Божага бляску, лічбавыя ўказанні Карану і хадзісаў, што сыходзяцца на ім, безумоўна, даказваюць, што ў прытрымліванні прароц-

кай місіі, у дачыненні служэння веры, ён стаў бліскучым люстэркам. У яе дрэве – завяршальным светлым плодам. І ў яе звароце, з пункту гледжання спадчыны, – самымі апошнімі вуснамі ісціны. У Божым служэнні веры – самым апошнім носьбітам шчасця.

Ад імя вучняў Святла, якія выслухалі адзін толькі ўрок Эльхуджатуз-Зехра і Зухратун-Нур у трэцім медрасе Юсуфіе:

*Ахмед Фейзі, Ахмед Назіф, Саллахаддзін, Зубейр, Джэйлан, Сунгур, Табанджалі.*

Нягледзячы на тое, што маім заслугам надалі ў сто разоў большую ступень, у мяне не знайшлося смеласці крануць пашану гаспадароў гэтых надпісаў. Моўчкі прымаю хвалу ад імя духоўнай асобы «Рысале-і Нур».

*Саід Нурсі*

* * *

# Біяграфія

Бадзіуззаман Саід Нурсі паходзіў з курдскай вёскі Нурс у Турцыі. Будучы асветнік і багаслоў нарадзіўся ў 1876 г. З ранняга дзяцінства ён выяўляў асаблівую цікавасць да ведаў і адрозніваўся надзвычайнай памяццю. У 16 гадоў ён пераехаў у г. Ван, дзе самастойна вывучаў такія навукі, як матэматыка, гісторыя, геаграфія, фізіка, біялогія і інш. Тут Саід Нурсі быў прыняты кіраўніком адміністрацыі горада, які прывёў словы міністра Велікабрытаніі па пытаннях каланіяльных уладанняў Гладстон пра тое , што «пакуль Каран будзе ў руках мусульман, еўрапейцы не змогуць быць сапраўднымі гаспадарамі над мусульманамі». На гэта Саід Нурсі адказаў, што Каран з'яўляецца невычэрпнай крыніцай святла і ніколі не згасне. З таго часу ён вырашыў заняцца распаўсюджваннем ісцін Карану і адкрыць у Турцыі ісламскі ўніверсітэт, які б выпускаў вучоных па Ісламу.

Для дасягнення гэтай мэты Нурсі пераехаў у Стамбул. Яго ідэя адкрыць новую на-

вучальную ўстанову была перададзена султану, аднак ёй не наканавана было спраўдзіцца. У сталіцы малады навуковец прымаў актыўны ўдзел у дыспутах і дыскусіях на рэлігійныя тэмы. Турэцкія багасловы, прызнаючы веды і дзіўную памяць выхадца з вёскі Нурс, назвалі Саіда «цудам часу» – «Бадзіуззаманам». Нурсі адрозніваўся ад іншых багасловаў тым, што заўсёды называў навуку саюзнікам рэлігіі і, спасылаючыся на навуку, даказваў ісціну існавання Бога і стварэння Ім сусвету. Менавіта такімі былі яго пропаведзі ў розных гарадах імперыі.

У 1914 г. Асманская імперыя вымушана ўступіла ў Першую сусветную вайну. Саід Нурсі добраахвотнікам пайшоў у войска і прымаў удзел у баях за вызваленне Вана, Бітліса і Муша. За гераізм, праяўлены ў баях, Нурсі даслужыўся да камандзіра добраахвотніцкага батальёну, але пасля няўдалай ваеннай аперацыі трапіў у палон да рускіх і быў высланы ў Кастрамскую губерню. Мясцовая татарская абшчына паручылася за Саіда і ўзяла яго ў сваю невялікую мячэць, дзе ён і жыў. У 1917 г. у Расіі адбылася кастрычніц-

кая рэвалюцыя. Нурсі атрымалася збегчы з Кастрамы ў Пецярбург, а адтуль – у Польшчу. Праз Еўропу ён прыбыў у Турцыю, якая была фактычна падзелена паміж краінамі Антанты.

Саід Нурсі выступаў супраць скасавання асманскага халіфату і кіравання краінай нерэлігійнымі законамі. Секулярызм для Турцыі ён лічыў памылковай з'явай. Ужо як вядомы ісламскі навукоўца Нурсі выступіў у парламенце краіны, дзе казаў пра такія рэлігійныя ісціны, як вера ў Бога і мусульманская пяціразовая малітва. З гэтай нагоды Атацюрк выказаў глыбокае абурэнне, на што Саід Нурсі ў адказ сказаў: "У Сусвеце самая вялікая ісціна – гэта вера, пасля веры – малітва...». Не знайшоўшы паразумення з кіраўніцтвам новага ўраду, ён вярнуўся ў Ван і аддаліўся ад грамадска-палітычнага жыцця.

Асноўнай працай жыцця Бадзіуззамана Саіда Нурсі стаў 14-ці томны збор твораў, які прадстаўляе сабой каментары (тафсіры) Карану пад назвай «трактаты Свету» – «Рысале-і Нур». У іх Нурсі тлумачыў свае погляды ў тэрмінах суфізму, таму ў яго працах

ёсць такія паняцці, як святло, прамень, ззянне. У творах «Рысале-і Нур» аўтар часта звяртаецца да параўнанняў для доказу веры, існавання Бога, Рая, Пекла, анёлаў, і г.д., якія лёгка зразумелыя чалавеку XX стагоддзя. У працах Нурсі асновы веры даказваюцца з дапамогай заснаваных на розуме лагічных довадах і доказах.

Нягледзячы на велізарны ўплыў на грамадства ідэолагаў атэізму, кнігі Саіда Нурсі і сёння набываюць вялікую папулярнасць. Гэта тлумачыцца, перш за ўсё, адсутнасцю ў яго працах закліку да гвалту. Выкладаючы ў сваім цыкле «Рысале-і Нур» сваё тлумачэнне Карану, ён казаў пра тое, што мусульманскае вучэнне не ўхваляе гвалту і рэлігійнай нецярплівасці, паважае правы чалавека. У сувязі з гэтым ён лічыў, што «людзі Пісання» – хрысціяне і мусульмане – павінны разам супрацьстаяць бязбожнасці і распусце. З такімі ідэямі ён напісаў ліст у Ватыкан і наведаў Канстанцінопальскі патрыярхат.

Пазітыўная дзейнасць, якую ён наказваў сваім вучням, змяшчалася ў тым, каб праяўляць міласэрнасць і растлумачваць нядобразычліўцам сваю правату шляхам дыспутаў і доказаў, не выяўляючы агрэсіі.

Пасля пераходу Турцыі на шматпартыйную сістэму ў 1946 г. і прыходу да ўлады Дэмакратычнай партыі, кнігі «Рысале-і Нур» набылі яшчэ большую папулярнасць у краіне. У выніку сумеснай працы студэнтаў універсітэтаў Стамбула і Анкары і навукоўцаў з Упраўлення па рэлігійных пытаннях (Дыянет) пачалося афіцыйнае выданне кніг «Рысале-і Нур». Усе кнігі Бадзіуззамана, надрукаваныя ў Стамбуле і Анкары, накіроўваліся да яго. Яго вучні чыталі іх, а Саід Нурсі звяраў іх з рукапісамі-арыгіналамі, якія былі напісаны арабскімі літарамі. Такім чынам, кнігі рэдагаваліся і накіроўваліся ў выдавецтва.

У сакавіку 1960 г. Саід Нурсі цяжка захварэў і памёр. Згодна з яго запаветам, месца яго пахавання так і не было абвешчана шырокай грамадскасці. Сёння кнігі «Рысале-і Нур» перакладзены на больш чым 50 моў свету.

* * *

# Змест

Першае Слова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6
Другое Слова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
Трэцяе Слова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17
Чацвёртае Слова. . . . . . . . . . . . . . . . . . 23
Пятае Слова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28
Шостае Слова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34
Сёмае Слова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
Восьмае Слова . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
Дзевятае Слова . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71
Дваццаць першае Слова . . . . . . . . . . . 91
Пасляслоўе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106
З кнігі «Ішарат-уль Іджаз» . . . . . . . . . 111
Уступ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 112
Што такое «Рысале-і Нур»? . . . . . . . . . 119
Біяграфія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 125

Так, чалавек мае патрэбу шмат у чым, але яго капітал блізкі да нуля... І акрамя таго, што ён схільны да шматлікіх бедаў, яго магчымасці нікчэмна малыя... Межы аб'ёму яго капіталу і магчымасцяў толькі ледзь дасягаюць ахопу яго рук. Аднак яго імкненні, жаданні, беды і пакуты настолькі бязмежныя, наколькі змогуць ахапіць іх межы думкі, погляд, мары, наколькі наогул магчыма ўявіць. Такім чынам, той, хто цалкам не аслеп, убачыць і ўсвядоміць наколькі пакланенне Усявышняму, спадзяванне на Яго, адзінабожжа і пакорлівасць з'яўляюцца вялікай карысцю, дабрабытам і міласцю для настолькі бездапаможнай і слабой, беднай чалавечай душы, якая жыве ў нястачы.

Саід Нурсі

Павучанні Душы